

КАПРАМОНТ — КВАРТАЛАМІ

МС

НА ПРАЦУ — У ПУШЧУ

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 20 (29134)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёлета павінна быць забяспечана выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы па рамонце 7 тысяч кіламетраў мясцовых дарог. Гэтая задача будзе выканана. Таксама стаіць сур'ёзная задача па рамонце мастоў і пуцеправодаў. Планы такіх мерапрыемстваў падрыхтаваны і ўзгоднены, забяспечаны фінансаваннем. Для гэтага плануецца выдзяляць фінансаванне не толькі за кошт унутраных рэзерваў, будуць таксама прыцягвацца крэдытныя рэсурсы еўрапейскіх банкаў. У бліжэйшы час у нас у рабоце будзе парадку 12 мастоў і пуцеправодаў».*

# «Чыстая» будоўля



**Адным з аб'ектаў сталічнага будтрэста № 35 з'яўляецца рэканструкцыя найстарэйшай лазні ў Мінску, якая знаходзіцца па вуліцы Багдана Хмяльніцкага, побач з рэспубліканскім Домам прэсы. Цяпер муляры, цесляры і бетоншчыкі (на будоўлі задзейнічана амаль сорак такіх спецыялістаў) узводзяць наружныя цагляныя сцены другога паверха будынка, заліваюць перакрыцці — імкнуцца ў вызначаны час здаць важны для сталіцы сацыяльны аб'ект. Сярод іх шчыруюць Аляксандр ДЗЕРАВЯГА, Кірыл ТРЫФАНАЎ і Уладзіслаў ЧАПЯЛЕВІЧ *(на гэтым фота яны злева направа)* з 201-га будаўнічага ўпраўлення. Дарэчы, за сваю саракагадовую гісторыю сталічны трэст узводзіў самыя розныя сацыяльныя аб'екты: школы, стадыёны, бальніцы, а лазню — упершыню!**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталляй Качанавай, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Ігарам Сергеенкам і кіраўніком спраў Прэзідэнта Віктарам Шэйманам.**
- Турыстычныя магчымасці нашай краіны прэзентавалі на выстаўцы ў Вільнюсе.
- **Начальнік паштовага аддзялення ў Мінскім раёне прысвоіла больш за 18 тысяч рублёў.**
- У Беларусі мамы займаюцца з малымі ў тры разы часцей, чым таты, а 68 % бацькоў дапамагаюць школьнікам з урокамі.
- **Лаўрэатаў прэміі «Чалавек безбар'ернага асяроддзя» ўзнагародзілі ў сталіцы.**
- Жыхар Віцебска падкінуў на ганак царквы скрадзеныя ім ювелірныя ўпрыгажэнні.

ISSN 1990 - 763X

Экалагічная культура

# «КАЛІ ПАКЕТЫ БЫЛІ ПЛАТНЫЯ, ІХ БРАЛІ МЕНШ»

## Крамы плануюць адмаўляцца ад непатрэбнага пластыку. А што можам зрабіць мы?

**Вы бераце яйкі ў кардонным латку ці ў пластыкавым? А бананы вы кладзяце ў поліэтыленавы пакет? Гэта важна, таму што менш чым за 50 гадоў колькасць адходаў у Беларусі павялічылася ў пяць разоў! І сёння ад нашага выбару залежыць тое, ці ў чыстай краіне будзем жыць мы і нашы дзеці праз дзесяць і больш гадоў. Але варта прызнаць, што часта ўсё вырашаюць за нас. Напрыклад, касір без патрабавання можа пакласці ў пластыкавы пакет два яблыкі ці добра запакаваныя сыркі, а на просьбу гэтага не рабіць адказаць: «Пакет жа бясплатны!» Або ў краме ў прынцыпе можа не быць альтэрнатывы, і хочаш ці не, а даводзіцца купляць соль і цукар у пластыку, а не ў паперы. Рознічныя сеткі, як ніхто іншы, могуць уплываць на тое, якая ўпакоўка будзе выраблятца ў Беларусі. І, на шчасце, яны пачынаюць гэта рабіць.**



СТАР. 3

Наш кашалёк

# ПЛАТА ЗА НАЯЎНАСЦЬ

## Што трэба ведаць пры разліку гатоўкай у банках і на пошце



**Нягледзячы на тое, што ў нашай краіне дастатковая колькасць інфакіёскаў і іншых плацежных тэрміналаў, многія нашы людзі (асабліва старэйшае пакаленне) па-ранейшаму аддаюць перавагу аплаце паслуг у касах банкаў або на пошце. А тут разлічвацца наяўнымі стала нявыгадна. Не, навіна прыйшла не ўчора: з 1 кастрычніка 2018 года Беларусбанк ужо ўвёў камісію за прыём некаторых плацяжоў наяўнымі ў касах — 1 рубель. Магчымасцю плаціць без камісіі пры дапамозе інтэрнэту і мабільнага банкінгу многія і да гэтага часу не карыстаюцца, бо папросту не ўмеюць, іншыя — не давяраюць такой сістэме аплаты або баяцца памыліцца.**

**Мае знаёмыя (ім каля 40 гадоў) упарта і свядома не хацелі карыстацца плацежнымі карткамі і сістэмай аплаты праз каналы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання. Пасля таго як Беларусбанк увёў камісію за аплату гатоўкай, яны сталі хадзіць на пошту, каб заплаціць там за паслугі мабільнай сувязі. Дакладней, хадзілі. Бо калі раней нашымі страхамі карысталіся толькі банкі, беручы камісіі за плацяжы наяўнымі ў сваіх касах, то цяпер да іх далучылася і «Белпошта».**

СТАР. 4

З першых вуснаў

# «ГЭТЫ ГОД МЫ ПАВІННЫ ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНА ПАПРАЦАВАЦЬ, КАБ ПЕРААДОЛЕЦЬ НЕГАТЫЎНЫЯ З'ЯВЫ, ЯКІЯ ЁСЦЬ У ЭКАНОМІЦЫ»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай Снапкоў назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Яго пасаду ў Адміністрацыі зойме дырэктар інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Валерый Бельскі. Намеснікам кіраўніка спраў Прэзідэнта назначаны Генадзь Богдан, а дырэктарам Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта — Ігар Кудрэвіч.**

Прэзідэнт узгадніў на пасады старшыні Віцебскага гарвыканкама Вадзіма Заранкіна, кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста Андрэя Філановіча, намеснікаў міністра прамысловасці Дзмітрыя Харытончыка і Андрэя Буйневіча. Кандыдатуры Аляксея Рымашэўскага і Дзмітрыя Сакалоўскага ўзгоднены на пасады генеральных дырэктараў ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў» і ЗАТ «Атлант» адпаведна. Па ўзгадненні Прэзідэнта рэктарам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава стане Валянціна Багатырова, дырэктарам Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму — Ірына Варановіч, членам Мінскага аблвыканкама — Андрэй Ліс.


Фота БелТА.

### Задачы для рэгіёнаў

Узгадняючы кандыдатуры на пасады прадстаўнікоў рэгіянальнай улады, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Вадзім Заранкін і Андрэй Філановіч прызначаюцца ў вельмі важныя для краіны гарады.

Па яго словах, у Віцебску знайшлі свой дом прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцяў, таму гэты горад павінен застацца апорай талерантнасці. Прэзідэнт адзначыў, што горад з-за сваіх геаграфічных асаблівасцяў (знаходзіцца на ўзгорыстай мясцовасці) зручны для работы камунальных службаў.

Новага кіраўніка атрымаў адзін з двух раёнаў Брэста. У Маскоўскім раёне жыве 2/3 гараджан — 242 тысячы брастаўчан. Для горада, які адзначыў свой міленіум, зрабілі летась шмат. «Я мяркую, што мы ўсе аб'екты пабудавалі і больш-менш прывялі горад у парадак. Я казаў ужо старшыні аблвыканкама, што гэта вароты не толькі ў нашу краіну. Гэта вароты ва ўсю нашу Айчыну, былы Савецкі Саюз, таму трэба іх трымаць у парадку», — напомніў лідар краіны.

Ён асабліва звярнуў увагу на няпросты для краіны 2020 год, падкрэсліўшы, што асабліва напружвацца трэба Віцебшчыне і цэнтральнаму гораду рэгіёна.

### Далёкае і самае блізкае прызначэнне

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай Снапкоў накіроўваецца паслом у Кітай. Свае справы ён на працягу тыдня перадасць доктару эканамічных навук Валерыю Бельскаму.

Аляксандр Лукашэнка работу і кірункі дзейнасці на гэтых пасадах ведае вельмі добра, таму што яны значныя для дзяржавы.

Асабліва Прэзідэнт адзначыў назначэнне Мікалая Снапкова, які мае вопыт практычнай работы ва ўрадзе. Таксама добра ведае ён і кіраўніцтва Кітайскай Народнай Рэспублікі, таму менавіта Мікалая Снапкова накіравалі ў Паднябесную, якая з'яўляецца сур'ёзным прыярытэтам Беларусі ў міжнародным супрацоўніцтве.

«Мы ўсё больш і больш абапіраемся на дапамогу і падтрымку Кітая. Не толькі ў будаўніцтве перспектыўных прадпрыемстваў у нашай краіне, крэдытаванні, але і рынак Кітая адкрыты для нас настолькі, наколькі мы можам туды ўвайсці», — сказаў беларускі лідар.

Ён настроіў Мікалая Снапкова ажыццявіць прарыў на працягу работы ў Кітаі: ***«Гэта шчасце для нас, што мы ў свой час правільна выбралі курс на сяброўства з Кітаем, калі Кітай не быў яшчэ такі, які ён ёсць цяпер, калі толькі ўставаў на ногі».***

Кітай, Расія, Еўрапейскі саюз, Злучаныя Штаты Амерыкі — гэта гіганты, супрацоўніцтва з якімі лічаць за шчасце любыя дзяржавы. Не выключэнне — і наша краіна з яе экспартаарыентаванай эканомікай.

«Усё астатняе ў нас у супрацоўніцтве з Кітаем, як і з іншымі краінамі — Расіяй, Еўрасаюзам і ЗША — ёсць. ***Трэба гэты дом палітыка-дыпламатычны паставіць на трывалы фундамент»,*** — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Вялікую значнасць у будучай рабоце Валерыя Бельскага, на думку Прэзідэнта, будуць мець яго экспертныя ацэнкі нарматыўна-прававых актаў, якія ўносяцца кіраўніку краіны. У Адміністрацыю Прэзідэнта з урада і іншых органаў паступаюць усе дакументы, накіраваныя на разгляд першай асобы дзяржавы.

«Трэба настройвацца на гэтую сур'ёзную працу, — запатрабаваў лідар краіны. — Трэба будзе вельмі сур'ёзна планаваць пяцігодку. ***Ды і гэты год мы павінны вельмі сур'ёзна папрацаваць, каб пераадолець тыя негатыўныя з'явы, якія ёсць у эканоміцы,*** асабліва звязаныя з Расіяй. Страты, якія нам падкінулі нашы браты, мы павінны нівеліраваць за кошт іншых кірункаў».

Значнага паляпшэння работы Аляксандр Лукашэнка чакае ад Кіраўніцтва справамі. Займацца гэтым будзе і новы намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Генадзь Богдан. Да яго патрабаванне — закрыць усе «хвасты», калі яны ёсць, на яго мінулай пасадзе дырэктара рэспубліканскага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Беларусьгандаль».

Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта ўзначаліць Ігар Кудрэвіч. Шматлікія пытанні ўстановы былі замкнуты на лідара краіны з-за льгот па гуманітарных пастаўках, таму неўзабаве яе дзейнасць будзе зменена.

«Што я заўважыў гадоў 20 таму, калі давялося гэта на сябе замкнуць, а можа, нават і больш, — гуманітарнай дзейнасцю ў нас больш за ўсё займалася апазіцыя. І яны на працягу аднаго года сталі багатыя. Яны тут хадзілі, па гэтых вуліцах, гвалтам крычалі. Адкуль грошы? Сталі вывучаць, Камітэт дзяржбяспекі займаўся гэтым пытаннем. І аказалася, што гэта гуманітарная дапамога. І тады я ўзяў пад кантроль гэтае пытанне», — расказаў кіраўнік краіны.

### «Атланту» расправіць плечы!

Аляксею Рымашэўскаму, новаму генеральнаму дырэктару ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў», Прэзідэнт паведаміў, што вельмі любіць гэта прадпрыемства, бо яго складаныя даручэнні яно хутка выканала: стварылі машыны, неабходныя нашай арміі і запатрабаваныя на міжнародных рынках.

«Гэта значыць, патэнцыял, кампетэнцыі вельмі высокія ў вашых людзей. І я вельмі хацеў бы, каб вы захавалі іх. І зусім бы не хацеў, каб вы некалі ўнеслі мне прапанову аб прыватызацыі гэтага прадпрыемства. У тым ліку замежнікамі, — папярэдзіў лідар краіны і падкрэсліў: — Вельмі цікавы завод з пункту гледжання навукаёмістасці. Гэта вялікая навука на гэтым заводзе. ***Вы навучыліся канкурыраваць. Шматлікія рэчы ствараеце такія, якія робяць дзве-тры краіны ў свеце. І мы павінны вытрымаць канкурэнцыю».***

Будучыня «Атланта», суседа цераз дарогу, вельмі хвалюе Аляксандра Лукашэнку. «Кожны дзень, бываючы тут, у рэзідэнцыі Прэзідэнта, Палацы Незалежнасці, я гляджу на «Атлант» і адразу ўспамінаю ўсе недахопы і хібы, якія ў вас ёсць», — сказаў лідар краіны і паабяцаў, што ў хуткім часе прыедзе на завод.

Канкурэнцыя, на яго думку, не з'яўляецца для рэальнага сектара нашай краіны апраўданнем: «Легкавых машын у свеце мора — канкурэнцыя... Грузавікоў і трактароў — таксама мора. І мы неяк канкурыравалі раней, а сёння хтосьці рукі апусціў, у тым ліку і на «Атланце». Таму думайце. Вы малады чалавек, вам жыць і працаваць. Вы свой лёс звязалі з гэтым прадпрыемствам. Думайце, як мы будзем выходзіць з існуючага становішча».

Прызначанаму рэктару Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава Валянціне Багатыровай Прэзідэнт параіў скарыстацца магчымасцю і звярнуцца да прадстаўнікоў вышэйшай улады з праблемамі ўстановы, падкрэсліўшы, што Віцебшчынай цяпер займаецца ўся краіна.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

«Прэзідэнт даручыў узмацніць экспертна-аналітычнае забеспячэнне работы ўрада, іншых органаў, якія выпрацоўваюць рашэнні ў вобласці эканомікі. Гэтыя рашэнні павінны быць накіраваны на стымуляванне эканамічнага росту, узмацненне дабрабыту беларускага народа, павышэнне сацыяльнай абароненасці нашага насельніцтва і забеспячэнне далейшага прагрэсу дзяржавы, устойлівага яе развіцця. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтыя задачы пастаўлены ва ўмовах супярэчнасцяў, якія склаліся сёння на важным для нас кірунку — гандлі энерганосьбітамі, якія займаюць важную долю ў знешнім гандлі і забяспечваюць у цэлым працаздольнасць нашай эканомікі», — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый БЕЛЬСКІ.**

«Задача, як заўсёды, простая і глыбокая, вызначаная Прэзідэнтам, — высокі дом, высокага палітычнага ўзроўню нашых узаемаадносін паставіць на магутны фундамент глыбокага эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва», — растлумачыў метафару Прэзідэнта **Мікалай СНАПКОЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол у Кітайскай Народнай Рэспубліцы.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША падрыхтаваліся да павышэння цэн на нафту ў тры разы



У 2050 годзе цэны на нафту могуць вырасці ў тры разы ў параўнанні з цяперашнім узроўнем. Пра гэта гаворыцца ў штогадовым прагнозе ўпраўлення энергетычнай інфармацыі Міністэрства энергетыкі ЗША. Падрыхтавацца да павышэння кошту сыравіны маркі Brent да 183 долараў за барэль давядзецца ў выпадку, калі галіна сутыкнецца з істотным ростам выдаткаў. У той жа час калі выдаткі акажуцца нізкія, то цэны на нафту могуць, наадварот, апусціцца да 46 долараў. Базавы сцэнарый прадугледжвае, што кошт вырасце да 105 долараў за барэль, а ніякіх значных змен у заканадаўстве не адбудзецца.

### Парламент Эстоніі ўхваліў пенсійную рэформу



Парламент Эстоніі ў другім, заключным чытанні ўхваліў законапраект аб пенсійнай рэформе і выказаў давер ураду. Аб гэтым паведаміла прэс-служба вышэйшага заканадаўчага органа рэспублікі. Мэтай пенсійнай рэформы з'яўляецца перавод абавязковай накапляльнай пенсіі (другой пенсійнай прыступкі) на добраахвотную аснову. Законапраект пенсійнай рэформы выклікаў крытыку з боку парламенцкай апазіцыі, шэрагу палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, таму ўрад вырашыў звязаць галасаванне па законапраекце з галасаваннем аб даверы кабінету міністраў. У тлумачальнай запісцы да законапраекта гаворыцца, штоператварэнне другой пенсійнай прыступкі ў добраахвотную пашырыць выбар людзей і дасць магчымасці інвеставання, а таксама ўзмоцніць канкурэнцыю паміж пенсійнымі фондамі. Пасля прыняцця закона назапашаныя сродкі можна будзе забраць для выкарыстання паводле свайго меркавання, пакінуць у пенсійным фондзе або перавесці на інвестыцыйны рахунак для самастойнага інвеставання.

Блізкая ўлада

## Званіце ў першы дзень лютага

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу 1 лютага ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Васіль Іванавіч АКУЛІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

# МЕСЦА СУСТРЭЧ: «КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА»

**У пярэдадзень XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ўзнавіў сваю работу слаўны «гандлёвы пункт» ААТ «Белкніга» — «Кнігарня пісьменніка».**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Першую экскурсію па гандлёвай зале пасля сур'ёзнага рамонту правёў слаўны Несцерка — герой п'есы Віталя Вольскага. Павіншаваць гандляроў і пакупнікоў прыйшлі, зразумела, пісьменнікі і, канешне ж, юныя чытачы. Сваімі развагамі пра тое, што сёння значыць кнігагандаль для пашырэння ўвагі да беларускай кнігі, падзяліўся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі вядомы празаік, грамадскі дзеяч Мікалай Чаргінец. Выступілі і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» паэт і празаік Алесь Бадак, мангольскі перакладчык, публіцыст, журналіст Бадам-Ачырын Галаарыд. Дарэчы, «Кнігарня пісьменніка» стане апорным пунктам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Менавіта ў гэтай краме можна будзе набыць любую кнігу выдавецтва з аўтографам паэта ці празаіка. Варта толькі папярэдне замовіць яе.

— «Кнігарня пісьменніка» — адзін з адрасоў, якія добра вядомы цікаўным да кнігі мінчанам, ды і не толькі мінчанам, — кажа **дырэктар «Белкнігі» Аляксандр ВАШКЕВІЧ.** — Мы вырашылі ажыццявіць цэлую праграму па абнаўленні кнігарняў сталіцы, наданні ім прыстойнага, утульнага выгляду. Мяркуючы па статыстыцы, у краіне выдаецца досыць шмат кніг. Значыць, цікаўнасць да папяровых выданняў не зніжаецца. Гэта для нас добрая статыстыка — і «Белкніга» яшчэ болей намагацьмем будзе прыкладаць да прапаганды кнігі. І мастацкай кнігі, выданняў для дзяцей і падлеткаў — у першую чаргу.

Варта нагадаць, што апошнім часам адкрыліся новыя кнігарні ў Бабруйску, Магілёве, Віцебску, Оршы, Слоніме, іншых гарадах краіны.

**Кастусь ХАДЫКА.**

## Надвор'е

# Спачатку трохі зімы, а потым дождж

**Першы месяц года ў Беларусі выдаўся анамальна цёплы, і толькі ў канцы месяца з'явілася снежнае покрыва вышынёй ад 1 да 12 сантыметраў. Па Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях, дзе ў сераду ўдзень і ўначы выпала больш за ўсё ападкаў, назіраецца адклад мокрага снегу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Аднак ужо сёння з Заходняй Еўропы чакаецца зрушэнне ва ўсходнім напрамку цёплых паветраных мас, і снег стане інтэнсіўна раставаць.

Як прадказваюць сіноптыкі, у пачатку лютага па-ранейшаму будзе воблачна. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца ападкі, у асноўным дождж. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ў суботу ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, удзень — ад плюс 2 па ўсходзе да 9 градусаў вышэй за нуль па захадзе краіны. У нядзелю будзе без замаразкаў нават уначы. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад плюс 1 градуса да 8 градусаў вышэй за нуль, удзень — ад плюс 3 да 9 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак захаваецца анамальна цёплае надвор'е. Спецыялісты падлічылі, што зіма зноў надыдзе (пойдзе снег, мокры снег і падмарозіць) толькі ў сярэдзіне наступнага тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Прэч руціну!

# Сталіца Палесся «памаладзела»

**Рэспубліканскае свята «Маладзёжная сталіца Рэспублікі Беларусь—2020» урачыста адкрылася ў Пінску. Яго ўдзельнікамі сталі каля 500 чалавек. Эстафету маладзёжнай сталіцы горад атрымаў ад Оршы.**

— Задача развіцця малой радзімы і рэалізацыя ініцыятыў моладзі ў гэтай сферы сёння актуальныя як ніколі, — падкрэсліў, звяртаючыся да маладых людзей, **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** — Мы спадзяёмся, што вашы ідэі па паляпшэнні якасці жыцця ў розных гарадах Беларусі ў найбліжэйшай будучыні дадуць рэальны практычны вынік. У маладзёжнай сталіцы на працягу ўсяго года будуць праводзіцца розныя рэспубліканскія мерапрыемствы, горад стане платформай для падтрымкі і развіцця маладзёжных праектаў. Упэўнены, Пінск справіцца з гэтай задачай, а ганаровае званне натхніць пінчан прадставіць сябе з найлепшага боку.

Праграма рэспубліканскага свята ўключае рэспубліканскі форум #БеларусьМоладзьІніцыятыва, прафарыентацыйныя майстар-класы, выстаўкі-прэзентацыі, канцэрты. У Палескім дзяржаўным універсітэце адукацыйны семінар «Універсітэт 3.0 і дзяржаўная маладзёжная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь» збярэ прарэктараў ВНУ. Ва ўніверсітэцкім клубе пройдзе інтэрактыўная прэзентацыя дзейнасці Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра.

Учора ў рамках рэспубліканскага свята адбыўся ўрачысты мітынг-рэквіем у Мемарыяльным комплексе вызваліцелям горада.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## На слыху

# ЗАВАЗНЫЯ ВЫПАДКІ МОГУЦЬ З'ЯВІЦЦА Ў ЛЮБЫМ МЕСЦЫ

### Таму краінам раяць быць гатовымі да прыняцця ўсіх неабходных мер

**У Магілёве ў шпіталізаваных пазаўчора траіх чалавек, якія вярнуліся з адпачынку ў Кітаі з прыкметамі вострай рэспіраторнай інфекцыі, дакладна ўстанавілі дыягназ. Каранавіруса ў іх няма, пацвердзіла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Два чалавекі адпачывалі на востраве ў Кітаі, вярнуліся з павышанай тэмпературай і вырашылі падстрахавацца — звярнуліся па медыцынскую дапамогу. Іх шпіталізавалі для правядзення лабараторных аналізаў. Пазней да ўрачоў звярнуўся яшчэ адзін магілёўчанін, які вярнуўся з КНР.

— На цяперашні момант у РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі абследавана 74 чалавекі, з іх 25 — грамадзяне КНР, 6 — Украіны, астатнія — беларусы. Большая частка з іх прыбыла з Кітая. Акрамя гэтага, усе, хто прыбыў у нацыянальны аэрапорт 29 студзеня і дагэтуль знаходзіўся на тэрыторыі КНР, былі лабараторна абследаваныя на наяўнасць новага варыянта каранавіруса, а гэта 47 чалавек. Новы каранавірус 2019-nCoV не выяўлены, — паведаміла Юлія Барадун.

У выніку абследаванняў дыягнаставаны адзін выпадак віруса грыпу В, 3 — грыпу А (H1N1), адзін выпадак рынавіруса, 3 — мікаплазмы пнеўманіі, адзін — змешаны (грып і мікаплазма пнеўманіі). У рабоце знаходзіцца 18 узораў: шэсць ад пацыентаў з клінікай вострай рэспіраторнай інфекцыі і 12 ад клінічна здаровых асоб.

— РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі мае ўсе неабходныя рэактывы, абсталяванне, тэхналогіі і высокакваліфікаваны персанал з вялікім вопытам правядзення даследаванняў. Цэнтр працуе ў штатным рэжыме — 24 гадзіны ў суткі, — адзначыла Юлія Барадун.

Яна звярнула ўвагу, што брыгады хуткай медыцынскай дапамогі могуць выкарыстоўваць спецыяльнае адзенне і біябоксы для транспарціроўкі пацыентаў у цяперашняй санітарна-эпідэміялагічнай абстаноўцы.

Нагадаем, што Надзвычайны камітэт, скліканы Генеральным дырэктарам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя на мінулым тыдні, адзначыў, што чакаецца далейшае міжнароднае распаўсюджванне віруса 2019-nCoV і завазныя выпадкі могуць з'явіцца ў любой краіне.

**Алена КРАВЕЦ.**

# «КАЛІ ПАКЕТЫ БЫЛІ ПЛАТНЫЯ, ІХ БРАЛІ МЕНШ»

## «Палова адходаў — гэта пластыкавая ўпакоўка»

Буйная гандлёвая сетка палічыла: кожны дзень адзін гіпермаркет выдае пакупнікам 47 тысяч пластыкавых пакетаў, а ўся сетка — 285 тысяч. За год атрымліваецца 5,2 мільярда пакетаў! Лічба пужае, калі ўлічыць, што пластыкавы пакет раскладаецца больш за сто гадоў.

У 1972 годзе ў Беларусі заставалася каля 4,5 мільёна кубічных метраў камунальных адходаў у год, у 2002-м — ужо 10 мільёнаў, а ў 2018 годзе — да 22 мільёнаў.

— Гэта звязана з тым, што вельмі моцна змяніўся састаў камунальных адходаў. З'явілася больш упакоўкі, у асноўным пластыкавай. Яна горш за ўсё перапрацоўваецца не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце, — адзначыла **дырэктар дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталля ГРЫНЦЭВІЧ.**

Паводле інфармацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у нашай краіне ўтвараецца каля 280 тысяч тон пластыкавых адходаў у год, палова з іх — гэта ўпакоўка. Збіраецца і перапрацоўваецца з іх крыху больш за трэціну, а рэшта ідзе на палігон.

— Пластык зручны, лёгкі, ён дазваляе павялічыць тэрмін захавання тавараў. І праблема не ў самім матэрыяле, а ў яго аднаразовасці. 40 % усіх пластыкавых вырабаў служыць нам менш за месяц. Мы не выступаем за поўную адмову ад пластыку. Сёння гэта нават немагчыма. Мы за разумнае стаўленне да яго. Бо яшчэ адна вельмі важная праблема — разнастайнасць пластыкавай упакоўкі. Адзін толькі дзясятак яек можа быць запакаваны ў чатыры яе розныя віды. І калі кардон і ПЭТ можна перапрацаваць, то полістырол і ўспенены полістырол пойдзць на звалку, — адзначыла спецыяліст.

## «А ці патрэбны мне гэты пакет?»

Рознічныя сеткі могуць выбіраць, у якой упакоўцы прапаноўваць тавар сваім пакупнікам. Напрыклад, ужо згаданы рытэйлер з 1 сакавіка пачне прадаваць яйкі выключна ў той тары, што перапрацоўваецца ў Беларусі. Зменяцца і стандарты работы касіраў — яны пачнуць прапаноўваць альтэрнатыву пластыкавым пакетам. Аднаразовыя талеркі, трубачкі з пластыку заменяць на папяровыя аналагі без пластыкавага слою. Плануецца, што з 2023 года ў гандлёвай сетцы 50 % тавараў будзе прадавацца ў той упакоўцы, якая перапрацоўваецца, а з 2025-га — ужо 85 %.

— Мы заўважылі, што калі фасовачныя пластыкавыя пакеты былі платныя, іх бралі на 30-35 % менш. Спадзяёмся, на заканадаўчым узроўні такая бясплатная ўпакоўка будзе забаронена ці хоць знімуць патрабаванне аб яе абавязковай наяўнасці. Мы гэта прапануем не дзеля таго, каб зарабіць. Гэтыя грошы гатовы аддаваць на падтрымку экалагічных ініцыятыў. Проста цяпер пакупнікі нічым не абмежаваныя. З аднаго боку, не хапае ведаў, што гэтыя поліэтылен шкодзіць прыродзе, але з другога — адсутнічае стымул задумацца, а ці патрэбны мне гэты пакет, — адзначыў прадстаўнік гандлёвай сеткі.

Аднак **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства гандлю і антыманапольнага рэгулявання Міхаіл ЖЫГАЛА** адзначыў, што тэма пластыкавых пакетаў — дастаткова дыскусійная. Калі зрабіць іх платнымі, то атрымліваецца, што клопат пра прыроду цалкам кладзецца на плечы спажыўца. А гэта, хутчэй за ўсё, не зусім правільна. Да таго ж нідзе не прапісана, што бясплатныя павінны быць менавіта пластыкавыя пакеты. Атрымліваецца, рытэйлер можа сам выбраць больш экалагічную ўпакоўку. Але тыя ж папяровыя пакеты каштуюць значна больш за пластыкавыя і падыходзяць далёка не для ўсіх тавараў, таму рабіць іх бясплатнымі зусім не ў інтарэсах гандлёвых сетак.

Да таго ж спецыялісты адзначаюць, што экалагічнасць папяровых пакетаў — гэта міф. Той жа пластык мы можам выкарыстоўваць доўгі час, а папера хутчэйірвецца і можа прамокнуць. Але ключавое тут «доўгі час». Усё ж, на жаль, пластыкавы пакет у большасці сваёй адразу ідзе ў смецніцу. І тут, як падкрэсліў **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Вадзім ДЗЯМКО,** выбар застаецца за спажыўцом. Урадам Беларусі зацверджаны план мерапрыемстваў, накіраваных на паэтапнае зніжэнне долі палімернай упакоўкі і яе замяшчэнне на экалагічна бяспечную. Амаль усе гандлёвыя сеткі абавязаны прапаноўваць пакупнікам альтэрнатыву пластыкавым пакетам пасля прыняцця пастановы МАРГ № 72 ад 2 верасня 2019 года. Аднак кожны чалавек павінен памятаць пра асабістую экалагічную адказнасць і самастойна вырашаць, ці сапраўды яму трэба класці бананы ў пакет або нічога з імі не здарыцца і так.

**Кацярына ЦІТОВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПЛАТА ЗА НАЯЎНАСЦЬ

## Ад 60 капеек...

Дык вось, з першых дзён студзеня цяпер і ў касах паштовых аддзяленняў краіны за кожную аперацыю бяруць камісію ў памеры 60 капеек. Без дадатковай аплаты можна разлічыцца толькі па плацяжах у бюджэт, аплаціць камунальныя паслугі, стацыянарны тэлефон і пераводзіць грошы на дабрачынныя рахункі. Таксама не возьмуць 60 капеек за паслугі самой «Белпошты». А вось, напрыклад, за аплату паслуг мабільнай сувязі, інтэрнэт-правайдараў, аператараў кабельнага тэлебачання або ахоўнай сігналізацыі давядзецца пераплачваць. Вось і атрымліваецца, што пяць падобных плацяжоў — гэта плюс тры рублі да выніковай сумы. Грошы не вельмі вялікія, але для эканомных людзей (тым больш пенсіянераў) і гэтая сума будзе адчувальная.

У кантакт-цэнтры «Белпошты» растлумачылі, што камісія не будзе спаганяцца за аплату праз касу тых паслуг, якія аказваюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У сістэме АРІП гэта паслугі няні, сядзелкі, разавая і сацыяльная дапамога на даму, гурткі і іншае.

— Прыём плацяжоў — гэта дадатковая паслуга РУП «Белпошта». Раней плата за гэта не спаганялася. З 1 студзеня 2020 года за прыём некаторых плацяжоў праз касу мы сталі браць 60 капеек. Але калі плацеж прымаецца за сацыяльную паслугу, камісія за яго спаганяцца не павінна, — растлумачыла аператар кантакт-цэнтра. Акрамя таго, з 30 студзеня «Белпошта» падымае расцэнкі на некаторыя паслугі па перасылцы лістоў і пасылак. Напрыклад, кошт перасылкі заказнога ліста масай да 20 грамаў павялічыцца на восем капеек — да 1,98 рубля.

## ...да 5 рублёў за адзін плацеж

Што датычыцца банкаў, то там у якасці камісіі бяруць яшчэ больш. Так, у касах Беларусбанка з 15 студзеня за кожны здзейснены плацеж цяпер трэба плаціць два рублі. Такую суму возьмуць, калі вы, напрыклад, плаціце за навучанне ці паслугі інтэрнэт-правайдараў, прычым не толькі наяўнымі грашыма, але і па картцы ў касе. Як і раней, у Беларусбанку не возьмуць камісію з ветэранаў ВАВ, а таксама за плацяжы ў бюджэт (падаткі, зборы, пошліны, штрафы). Не трэба асобна плаціць за правядзенне плацяжоў на карысць грамадскіх аб'яднанняў, на дабрачынныя рахункі, за выплаты ў выглядзе ўзносаў страхавых агентаў і на карысць самога банка.

Пры аплаце ж асноўных і дадатковых камунальных паслуг у касах Беларусбанка пакуль дадатковых грошай браць не будуць. Ды ёсць адно «але». Цяпер у многіх аддзяленнях гэтага банка ў буйных гарадах краіны плата за камунальныя паслугі ў касах наогул не прымаецца. У такіх аддзяленнях ўстаноўлена 4, 5 або 6 інфакіёскаў. Кіраўніцтва банка лічыць, што гэтага цалкам дастаткова для закрыцця «камунальнай тэмы».

З 20 студзеня камісія за прыём наяўных грошай і здзяйсненне аперацыі па банкаўскай плацежнай картцы вырасла таксама ў касах БПС-Ашчадбанка і Прыёрбанка. Дадатковая плата па плацяжах на карысць выканаўцы паслуг стала каштаваць пяць рублёў. Гэтую суму давядзецца аддаць нават пры аплаце камуналкі ці электрычнасці. Атрымліваецца, што, прыняўшы плацеж, напрыклад, за камуналку, інтэрнэт і электрычнасць, банк дадаткова возьме з вас 15 рублёў.

З 1 лютага да вышэйпералічаных банкаў далучыцца яшчэ і Парытэтбанк. У яго касах пачнуць браць камісію ў памеры двух рублёў за прыём наяўных грошай па плацяжах за паслугі АРІП. Плаціць давядзецца за ўсе плацяжы, акрамя аплаты ў бюджэт (такіх як падаткі, зборы, штрафы і пошліны). Гэты банк таксама ўвёў камісію з 10 студзеня за выдачу ў касах наяўных па картках плацежных сістэм Visa International, Mastercard і плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ, эмітаваных іншымі банкамі. Узнагароджанне банка складзе 2,5 % ад сумы. Пры гэтым у плату не ўключана камісія банка-эмітэнта за аперацыю зняцця наяўных.

У іншых банках сітуацыя падобная. Праўда, некаторыя з іх вызначаюць памер камісіі ў працэнтах ад сумы плацяжу, акрэсліваючы пры гэтым мінімальны парог свайго ўзнагароджання. Такую форму камісіі практыкуе Белінвестбанк: у іх яна складае 2 % ад сумы, але не можа быць меншая за два рублі і большая за 80 рублёў. Такую ж суму бяруць і ў Ідэя Банку, але не менш за пяць рублёў, а ў Тэхнабанку — 0,5 %, пры гэтым ніжняя мяжа камісіі — два рублі, верхняя — 50 рублёў.

## Пасябраваць з інфакіёскам і (або) з банкаўскім работнікам

Сваю 80-гадовую маму я вучыў карыстацца банкаўскай карткай спачатку ў краме, а потым і ў інфакіёску. З крамай праблем не было наогул ніякіх. Ёй нават спадабалася гуляць у казку з гэтым чароўным «пластыкам». Запамінаеш чатыры лічбы, потым набіраеш іх — і ўсё: ні табе паперак, ні манет, якія можна згубіць. З інфакіёскам складаней. Разабрацца з алгарытмам дзеянняў — на гэта патрэбны час, а жалезная скрыня (кіёск, значыць) пачынае брыдка пішчаць — падганяць кліента. «Ад гэтага нервуешся і робіш памылкі», — абураецца мая дарагая матуля. Акрамя таго, з часам яе стаў падводзіць зрок, а лічбы на мігатлівым экране зліваюцца ў нейкія плямкі. Але з гэтай сітуацыі мая мама знайшла годнае выйсце.

Яна ўстаўляе картку ў інфакіёск, набірае пін-код і кліча работніка банка на дапамогу. «Разам з гэтай маладзенькай дзяўчынкай мы хуценька ўсё аплачваем, літаральна за некалькі хвілін. Рукі ж у яе спрытныя, так і бегаюць па кнопачках».

Добра ведаючы сваю маму, я строга цікаўлюся ў яе, ці не частуе яна супрацоўніцу па дабрыні душэўнай? «Не, яна не бярэ, нельга ёй. Ну, калі толькі маленькую шакаладку раз у квартал...» — ціха шэпча мая мілая бабулька.

Сотавыя тэлефоны цяпер ёсць ва ўсіх, у маладых і старых. На тэлефон як правіла кідаюць ад пяці да 10 рублёў. І што, за кожны такі плацеж у банку аддаваць ад двух да пяці рублёў? Гэта нейкі нонсэнс. А што рабіць тым, хто не разбіраецца ў камп'ютарах, інтэрнэт-банкінгах, а інфакіёск далёка ў суседняй вёсцы? Як быць тым, хто застаўся адзін, а дзеці, унукі — дзесьці ў вялікім горадзе? Выйсце ёсць і ў гэтай сітуацыі. Трэба проста патэлефанаваць сваім сваякам і прапанаваць ім аплаціць гэтую паслугу (канешне ж, безнаяўна), а грошы вярнуць потым — пры сустрэчы. Бо дыстанцыйна аплаціць паслугу можна з любога пункта нашай планеты. Галоўнае — ведаць рэквізіты.

## Цікавыя паслугі, дарагія і не вельмі

Сёлета Беларусбанк перагледзеў зборнік узнагароджанняў за аперацыі фізічных асоб. Дапаўненні і змены ўступілі ў сілу з 15 студзеня. У абноўленым зборніку існуе камісія за перавод наяўных грашовых сродкаў (здзяйсненне аперацыі па банкаўскай плацежнай картцы) у касе банка па плацяжах на будаўніцтва жылых памяшканняў, уступных, паявых, членскіх, мэтавых і дадатковых узносаў членаў арганізацыі забудоўшчыкаў, а таксама ўзносаў удзельніка долевага будаўніцтва на аплату будаўніцтва жылога памяшкання ў шматкватэрным жылым доме. Кошт гэтай паслугі будзе роўны 0,2 % ад сумы пераводу, але не меншы за два рублі і не большы за 50 рублёў. Перавод грашовых сродкаў на іншыя мэты прадугледжвае камісію, роўную 2 % ад сумы, але не меншую за два рублі і не большую за 80 рублёў.

Банк бярэ ўзнагароджанне за ажыццяўленне аперацый па крэдытах. Так, афармленне дагавора паручыцельства, афармленне дадатковага пагаднення да дагавора паручыцельства абыдзецца кліенту ў дзевяць рублёў, калі крэдыт выдаецца ў адпаведнасці з указамі Прэзідэнта або пастановамі Савета Міністраў на будаўніцтва або набыццё жылых памяшканняў. Афармленне такога дагавора паручыцельства ў іншых выпадках каштуе ўжо 26 рублёў. Складанне дагавора закладу — 50 рублёў, а камісійныя за ўнясенне змяненняў у крэдытны дагавор з ініцыятывы крэдытаатрымальніка — 25 рублёў.

У раздзеле «Іншыя аперацыі» ёсць выдача даведкі па крэдытах, якія прадстаўляюцца ў адпаведнасці з указамі Прэзідэнта і (або) пастановамі Савета Міністраў Беларусі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў, а таксама па льготных крэдытах. Яна абыдзецца ў шэсць рублёў. А вось атрыманне звестак па валютна-абменных аперацыях, курсах замежных валют, устаноўленых Нацыянальным банкам краіны, і курсах абмену валют устаноў Беларусбанка каштуе 18 рублёў за адзін дзень.

Аказваецца, у гэтым банку можна памяняць зношаныя, пашкоджаныя, але з прыкметамі плацежнасці грашовыя знакі замежнай валюты, сапраўднасць якіх не выклікае сумнення, на плацежныя грашовыя знакі той жа замежнай валюты тых жа або іншых наміналаў (замена наяўнай замежнай валюты ў доларах ЗША, еўра, расійскіх рублях). За гэтую паслугу бярэцца камісія, роўная 3 % ад сумы валюты, але не меншая за два рублі. Размен наяўнай замежнай валюты (долары, еўра, расійскія рублі) — 2 % ад сумы.

А вось прыём на інкаса наяўнай замежнай валюты, якая выклікае сумненне ў яе плацежнасці, для накіравання на даследаванне па плацежнасці абыдзецца ў 4 % ад сумы, але не менш чым у 10 рублёў.

І апошняе. Інфармацыйная паслуга па абвестцы шляхам накіравання паведамлення на нумар мабільнага тэлефона (СМС-паведамлення) і (або) паведамлення на электронны пошце (e-mail-паведамлення) каштуе 1,4 рубля ў месяц. Для кагосьці глупства, а для некагосьці не лішняя капейка...

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**
**13 февраля 2020 года на 2А открытом аукционе проводит 16-й от 12 сентября 2019 года, 17-й от 17 октября 2019 года, 18-й от 31 октября 2019 года, 1-й от 16 января 2020 года и 2-й от 30 января 2020 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 201 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном ДФ-3 в составе: кузов-фургон ДФ-3, № 4892, 1988 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0316490 дв. 879283, 1988 г. *4 кат. 5380 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 3500,00 | 700,00 |
| 208 | Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К-375 в составе: кузов-фургон К-375, № 02062, 1978 г. *2 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 263604, дв. 545904 1978 г. *3 кат. 1401 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 7700,00 | 1540,00 |
| 209 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-14 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 242286, 1987 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-14 ш. 0512436 дв. 194762 1987 г. *4 кат. 2557 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3000,00 | 600,00 |
| 212 | Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375, № 020235 1982 г. *2 кат.* Автошасси Урал-375 ш. 390203 дв. 753423 1982 г. *3 кат. 2 114 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 7700,00 | 1540,00 |
| 219 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н, № 210282 1982 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0309704 дв. 193578882 1982 г. *4 кат. 9793 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3000,00 | 600,00 |
| 220 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 65056126 1986 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66-15 ш. 0457113 дв. 114647 1986 г. *4 кат. 4412 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3500,00 | 700,00 |
| 1 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108710051 дв. 17526 1987 г. *4 кат. 8408 км* | г. Минск, в/ч 63755 | 65 000,00 | 13 000,00 |
| 2 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108501022 дв. 914407 1985 г. *4 кат. 382 км* | г. Минск, в/ч 63755 | 70 000,00 | 14 000,00 |
| 14 | Грузовой бортовой Урал-4320-0010-01 ш. 171098 дв. 510765 1991 г. *4 кат. 108 000 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 8300,00 | 1660,00 |
| 15 | Грузовой бортовой Урал-43202-0011-01 ш. L0141995 дв. 566681 1990 г. *5 кат. 63 176 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8200,00 | 1640,00 |
| 16 | Седельный тягач КамАЗ-5410 ш. 128689 дв. 743480 1985 г. *3 кат. 105 932 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7800,00 | 1560,00 |
| 17 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 535794 дв. 941791 1985 г. *4 кат. 50 325 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8800,00 | 1760,00 |
| 19 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 541936 дв. 945792 1985 г. *4 кат. 11 095 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8000,00 | 1600,00 |
| 21 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № б/н 1-32377 1988 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0529432 дв. 27687 1988 г. *4 кат. 4955 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3300,00 | 660,00 |
| 22 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 224282 1982 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0345995 дв. 04041 1982 г. *4 кат. 5230 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 3300,00 | 660,00 |
| 23 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) № 10Е8907022 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8907022 дв. 8915136 1989 г. *4 кат. 6499 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БА3658СМВИ 1989 г. *4 кат 626 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **13 февраля 2020 г. в 10.00.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 10 февраля 2020 года**.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **13 февраля 2020 г. с 9.00 до 9.45.**
**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **без НДС**. **Справки по тел./факсу: (017) 398 05 41.** Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» № 148 от 8.08.19 г., № 171 от 10.09.19 г.. № 180 от 21.09.19 г., № 235 от 11.12.2019 г.




## НЕ ХВАЛІ САМ СЯБЕ, ХАЙ ЛЮДЗІ ПАХВАЛЯЦЬ

...Пра мянушку гэты навасёлец паклапаціўся адразу. Ледзь не з першых дзён пасля пераезду мы, суседзі, сталі чуць яго ганарлівае «От у мяне!», «От у мяне!»

У яго — ну ўсё было найлепшае: куртка, люстра, пральная машына, крэслы, шпалеры, нажы, чаравікі, мэбля... Што ўжо казаць пра яго самога, ягоную жонку і сына?!

Здавалася б, ну і няхай: ты нажыў (ніхто не пытаецца як) — ты і карыстайся. Але ж не гань пры тым іншых.

Наш Хвалько (іначай яго ніхто і не зваў) гэтага не мог. Яго, як выглядала, хлебам не кармі, дай некага спыніць — у пад'ездзе, на вуліцы — дай пагаварыць ды пахваліцца, які ж ён багаты ды разумны, а нехта іншы — бедны і дурны. Нам з мужам ён, напрыклад, адкрытым тэкстам сказаў, што ў Германіі куды лепшыя машыны ўжо даўно на звалках згнілі, а мы на сваёй яшчэ ездзім... Маці-адзіночцы з першага паверха таксама «камплімент» адважыў, сказаў, што дачка ў яе хоць і выдатніца (з яго сынам у школу ходзіць), але ж брыдкая-брыдкая. У суседа справа (яго жонка прызналася) Хвалько папытаўся пра зарплату і заявіў, што за такія грошы не тое каб нешта рабіць, нават з хаты выходзіць нельга! «Перапала» і суседу злева. У таго (шчасце цвярозага...) Хвалько пацікавіўся ўзростам жонкі і, пачуўшы, што той усяго 32, сказаў, што яго Марына ў 45 выглядае лепей...

Карацей, неўзлюбілі мы новага суседа (і мелі за што): каб лішні раз не бачыцца, не псаваць настрой, стараліся бокам абысці. Шкада, што гэта не заўсёды ўдавалася, бо наш навенькі аказаўся досыць непаседлівы. Зранку ён спяшаецца то ў краму (хадзіў туды па некалькі разоў на дні), то на рынак, то ў гараж, то на прагулку... За некалькі месяцаў «сумеснага» жыцця мы трохі вывучылі яго маршруты, каб потым строіць свае.

Ну вось нядаўна вярталіся мы з мужам з паліклінікі. Прыкінулі, што ў гэты час наш Хвалько павінен ісці з гастранома. Каб не сустрэцца, вырашылі «даць кругаля» — прайсціся па скверы, падыхаць чыстым паветрам.

Пагулялі, хвілін праз сорак падышлі да свайго пад'езда, услых парадаваліся, што цяпер, дзякуй богу, не сезон і Хвалько не сядзіць на лаўчцы. Потым шчаслівыя, можна сказаць, ад таго, што з ім не сустрэліся, зайшлі на свой чацвёрты паверх і ўжо там (літаральна) аслупянелі, бо пачулі:

— Прывіта-аннечка!

Гэта, як вы здагадаліся, нам «прапеў» Хвалько.

Ад неспадзеўкі мы ледзь утрымаліся ад рогату! Ён, як аказалася, ключы свае дома забыў. А нас здалёку ўбачыў — вырашыў напрасіцца ў... госці — пасядзець, пакуль жонка прыедзе.

...Вось такі атрымаўся «падарунак». І пішу я пра яго з адзінай мэтай — каб нехта пачытаў і, магчыма, «пагледзеўся ў люстэрка», спытаў: «А я такім не бываю?» Бо нездарма ж нашы продкі казалі: «Хто сам сябе хваліць, хай пярун таго спаліць».

**М. Н.**

*г. Барысаў.*

## МАРЫ ЎСЁ Ж ЗБЫВАЮЦЦА...

Гады перабудовы помняцца павальным дэфіцытам і вялікімі чэргамі. Не перадаць, колькі здароўя ў іх патрачана, колькі часу змарнавана!

Каб пазбегнуць гэтага, я прыдумаў выйсце — сумяшчаў неабходнае з прыемным: браў што-небудзь чытаць.

Неяк раніцай, помню, «сарафаннае радыё» данесла навіну, што ў гастраноме каля кінатэатра «Кастрычнік» «выкінулі» (не падумайце дрэннага — у продаж...) мяса. Я, не раздумваючы, узяў грошы, сумку, часопіс «Полымя» і пайшоў па дэфіцыт.

Як і варта было чакаць, вялікая гандлёвая зала была запоўнена людзьмі. Усе стаялі, многія нерваваліся, сварыліся на тых, хто лез без чаргі, а я чытаў сабе «Зеніт» Івана Шамякіна ды час ад часу глядзеў: ці далёка ж да мэты?

Помню, чарговы раз падняў галаву і ўбачыў, што непадалёк стаіць мая супрацоўніца, разгублена азіраецца, шукае канец чаргі. Мне б з ёй павітацца, а я замест гэтага тузаю за рукаво ды грозна пытаю: «Ну, колькі ты будзеш швэндацца?.. Хочаш, каб чарга прайшла?»

На імгненне жанчына разгубілася, аднак тут жа ўсё зразумела: на вуха падзякавала мне і стала наперадзе...

Альбо вось яшчэ. Неяк мы — і ўсім калектывам — вырашылі адзначыць юбілей рэвалюцыі, пасля дэманстрацыі сабрацца на адной кватэры ў цэнтры горада, пасядзець за святочным сталом. Купіць да яго спіртныя напоі калегі даверылі мне.

Я зайшоў у гастраном, гэтым разам прыхапіўшы аповесць Барыса Васільева «Заўтра была вайна», заняў чаргу і, чытаючы, пацiху стаў набліжацца да запаветнага прылаўка. У гэты ж час стрэлкі гадзінніка (прычым досыць імкліва) набліжаліся... да перапынку на абед. А гэта азначала, што мне яшчэ цэлую гадзіну давядзецца недзе мерзнуць, а потым, магчыма, сысці без пакупак, бо дэфіцытны тавар маглі разабраць свае.

Тут ужо не да чытання!..

На гадзінніку, гляджу, 13:40, потым 50, 57, 59... І — ура! — я ўсё купіў, дасягнуў мэты!

Не паверыце: адчуванне было такое, быццам нашы футбалісты на вось гэтай, самай апошняй хвіліне такі забілі (!) вырашальны гол!

Я стрымліваў эмоцыі як толькі мог, бо інакш хтосьці з добразычліўцаў мог выклікаць карэту «хуткай».

...Нехта можа падумаць, што ў мяне добрыя ўспаміны і што чэргі я ўхваляю. Не, крый божа! Проста лічу, што, сутыкнуўшыся з праблемамі, трэба знаходзіць шлях да іх вырашэння і думаць пра лепшае. Ну, напрыклад: некалі, стоячы ў чэргах, мы спадзяваліся, што іх не будзе? І — бачыце — дачакаліся, дажылі!

**Мікалай Старых,**

*г. Гомель.*

## САМЫ ПАМЯТНЫ ВОДПУСК

За мяжу, за свет, як той казаў, беларусы ездзілі здаўна, але ж мужчыны (каб жанчыны, дык неяк не чуваць было) — зараблялі там золата, грошы, потым вярталіся дамоў, куплялі зямлю. Можа, на сваю галаву? Ды не аб тым размова.

| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Победитель торгов (покупатель) обязуется согласовать дальнейшее функциональное назначение использования объектов недвижимости с Мингорисполкомом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 года № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации» |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **11 февраля 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 31.01.2020 по 07.02.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

# Лютаўскія смяшынкі



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Імя святога, у гонар якога 14 лютага адзначаецца свята закаханых. **4.** Для добрага ката і ў лютым ... (прык.). **8.** Разумны ... робіць сям'і свята (прык.). **9.** Зіма марозная — ... спякотнае (прыкм.). **11.** Злуецца люты ..., што яму мала дней дадзена (прык.). **12.** Сцюдзёны ... — кажух зноўку адзень (прык.). **14.** «Любіць ... наш Ягорка, // Ну а санкі любяць горку». З верша Г. Аўласенкі «Як Ягорка ехаў з горкі». **16.** ... Навуменка. Імя беларускага пісьменніка, прафесара, доктара філалагічных навук, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны; 16 лютага — 95 гадоў з дня яго нараджэння. **17.** «Лепш бы, дачурка, твае губы балелі ад пацалункаў, чым ... ад камп'ютара». Цытата невядомага аўтара; 14 лютага — Дзень камп'ютаршчыка. **20.** ... бушуюць — вясну чуюць (прык.). **21.** «Як ... на небе начуе, // Як блукае ў лесе мядзведзь». З верша Я. Купалы «Хлопчык і лётчык»; 9 лютага — Дзень работнікаў грамадзянскай авіяцыі. **25.** На ... капель — ураджай на пшаніцу (прыкм); свята ..., або Грамніцы, адзначалі 15 лютага. **28.** Лютаўскі ... вясной пахне (прык.). **29.** «Шпарка ... імчацца у полі, // Сумна бомы гудзяць пад дугой». З верша М. Багдановіча «Зімовая дарога». **30.** Публічнае выкананне музычных і іншых твораў. **31.** Шэраг твораў, нумароў, якія перадаюцца па радыё, тэлебачанні; 13 лютага — Сусветны дзень радыё.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** ..., Бакагрэй, Зімабор; народныя назвы месяца лютага. **2.** «Вясёлы месяц ... , // Мяцеліцай раскуты, // Шумі, вятрамі грай». З верша М. Стральцова «Месяц ...». **3.** Уладар, манарх (устар.). **5.** Калі ... устае на задняя лапы і пачынае скрэбці сцяну — будзе завіруха (прыкм.). **6.** ... на дрэвах — да мароза (прыкм.). **7.** Рух у паветры. **10.** Снежныя шматкі буйныя — будзе ... (прыкм.). **13.** Недастатковая прапечанасць хлеба. **15.** Адходы пры малацьбе. **18.** Рыбная гаспадарка. **19.** У лютага два сябры: ... і завеі (прык.). **22.** Службовая асоба пры дыпламатычным прадстаўніцтве; 10 лютага — Дзень дыпламатычнага работніка. **23.** Адна ... тысячы людзей вучыць (прык.). **24.** Зорнае ... на Трыфана (14 лютага) — позняя вясна (прыкм.). **26.** Люты — ... звярыных вяселляў (прык.). **27.** «О матчына ...! Маленства вясны!». З верша А. Бачылы «Матчына ...»; 21 лютага — Міжнародны дзень роднай мовы.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**
**Па гарызанталі:** 1. Валянцін. 4. Сакавік. 8. Тата. 9. Лета. 11. Каратышка. 12. Дзень. 14. Санкі. 16. Іван. 17. Вочы. 20. Бычкі. 21. Месяц. 25. Стрэчанне. 28. Снег. 29. Коні. 30. Канцэрт. 31. Праграма.
**Па вертыкалі:** 1. Ветрадуй. 2. Люты. 3. Цэзар. 5. Кошка. 6. Іней. 7. Лёт. 10. Адліга. 13. Недапёк. 15. Ахвосце. 18. Рыбгас. 19. Мяцеліца. 22. Аташэ. 23. Кніга. 24. Неба. 26. Час. 27. Мова.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.59 | 17.48 | 8.49 |
| Віцебск — | 8.54 | 17.32 | 8.38 |
| Магілёў — | 8.49 | 17.38 | 8.49 |
| Гомель — | 8.40 | 17.40 | 9.00 |
| Гродна — | 9.13 | 18.03 | 8.50 |
| Брэст — | 9.08 | 18.10 | 9.02 |

### Месяц

*Маладзік 25 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Апанаса, Кірылы, Марыі, Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра.*
*К. Людвіка, Пятра, Яна, Яны.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Калі кот мяўкае, каб яму адчынілі дзверы ў пакоі, але не выходзіць, ён і не хоча выходзіць. Ён хоча, каб з пакоя выйшаў ты.**

— Доктар, мне трэба пахудзець.

— Вы нарэшце заклапаціліся пра сваё здароўе?

— Не, у мяне ўзнік канфлікт гахоў.

— Як гэта?

— Я праз абжорства не магу пралобадзейнічаць.

**Мой прыяцель пару месяцаў таму расстаўся з дзяўчынай. Кажа, што да гэтага часу не патраціў зарплату, атрыманую пасля расстання.**

Запіс у школьным дзённіку:

«Сярожа катэгарычна не наведвае ўрокі французскай мовы, заяўляючы мне, што ў Парыж ехаць не збіраецца з прычыны малога сямейнага бюджэту».




## Даты Падзеі Людзі

### 31 СТУДЗЕНЯ




**1850** год — нарадзіўся (Гродзенская губерня) Пётр Карлавіч Залескі, расійскі астраном, геадэзіст і тапограф. У 1871-м скончыў Беластоцкае рэальнае вучылішча, у 1873-м — Ваенна-тапаграфічнае вучылішча ў Пецярбургу. З 1874 года працаваў у Туркестанскім ваенна-тапаграфічным аддзяленні, з 1879-га быў памочнікам загадчыка Ташкенцкай астранамічнай і фізічнай абсерваторыі. У 1881—1913 гадах пад яго кіраўніцтвам праведзены маштабныя астранома-геадэзічныя, тапаграфічныя і гравіметрычныя работы. Рускае геаграфічнае таварыства ўзнагародзіла Залескага вялікім залатым медалём імя Літке (1895).



**1925** год — нарадзіўся (Чэрвень) Яўген Сяргеевіч Сірацінін, расійскі ваенны вучоны. У 1942—1988 гадах служыў ва Узброеных Сілах СССР. У 1955-м скончыў Ваенную артылерыйскую радыётэхнічную акадэмію, з'яўляўся правадзейным членам Акадэміі ваенных навук (1966), доктарам тэхнічных навук (1972), быў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР (1974), меў званне генерал-маёр-інжынера (1976), прафесара (1979), а таксама быў членам Расійскай акадэміі касманаўтыкі (1998). Аўтар навуковых работ па распрацоўцы і баявым выкарыстанні сродкаў і сістэм разведкі розных відаў. Удзельнічаў у распрацоўцы сістэм папярэджання аб ракетным нападзе, стварэнні першага радыёлакацыйнага комплексу і базавай радыёлакацыйнай станцыі папярэджання.

**1990** год — пастановай Архірэйскага сабора Рускай праваслаўнай царквы з часткі Магілёўскай праваслаўнай епархіі ўтворана Гомельская праваслаўная епархія, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка праваслаўнай царквы ў Беларусі.




**1705** год — выдадзены іменны ўказ Пятра І, які вызначаў, што ўсе судны, якія ходзяць па рэках, павінны быць пад сцягам адпаведнага ўзору.

**1715** год — нарадзіўся Клод Адрыян Гельвецый, філосаф-асветнік, адзін з ідэолагаў Французскай рэвалюцыі. Нарадзіўся ў сям'і прыдворнага, скончыў езуіцкі калегіум. Да 1751-га быў генеральным адкупшчыкам. Пасля зблізіўся з Мантэскё і Вальтэрам і прысвяціў сябе навуковым заняткам. Адзін з галоўных твораў Гельвецыя — трактат «Аб розуме» (1758) — быў забаронены і спалены.

**1910** год — нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Смірноў, расійскі геолаг, член АН СССР (1962). Лаўрэат Ленінскай прэміі (1972), Дзяржаўнай прэміі СССР (1986), Герой Сацыялістычнай Працы (1980).

**1961** год — адбыўся першы запуск ЗША ў космас жывой істоты. Шымпанзэ Хэм быў змешчаны ў касмічны карабель «Меркурый-Рэдстоўн-2», які запусцілі з касмадрома на мысе Канаверал. Карабель дасягнуў вышыні 157 міль (253 кіламетры). Палёт працягваўся 16 хвілін 39 секундаў. Далёкасць — 422 мілі (679 кіламетраў). Хоць у кабіне карабля ўпаў ціск паветра, Хэм не пацярпеў ад гэтага, бо быў апрануты ў скафандр. Карабель «Меркурый» паспяхова прыводніўся ў Атлантычным акіяне і быў падняты на выратавальнае судна.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 369.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 студзеня 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

31 студзеня 2020 г. № 4 (540)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# ЁСЦЬ ЖАДАННЕ — БУДЗЕ І РАБОТА!

## Колькасць раёнаў, дзе складана працаўладкавацца, зменшылася



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Штогод у Беларусі складаецца спіс тэрыторый, на якіх прысутнічае напружаная сітуацыя на рынку працы. Сёлета ў яго трапілі 28 раёнаў і адзін горад — Бабруйск. Варта сказаць, што ў пачатку мінулага года спіс налічваў цэлых 52 раёны і ўсё той жа Бабруйск. Добра, што тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы становіцца менш, але не можа не здзіўляць той факт, што сярод лідараў па беспрацоўі разам з Віцебскай аказалася і Мінская вобласць — цэнтральны рэгіён краіны. стар. 4

ІДЭІ ГОДА

# ВЕЛАПАРКОЎКА, СВЯТА, СПАРТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА...

## У Магілёўскай вобласці дэпутаты прафінансавалі шэраг карысных для грамадства ініцыятыў

**Нядаўна Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў падвяла вынікі сваёй работы за мінулы год і прэзентавала асабісты сайт. Без яго, калі збіраешся займацца сур'ёзнай работай, сёння не абысціся. Цяпер можна быць у курсе ўсіх спраў асацыяцыі. Сярод леташніх дасягненняў — рэалізацыя шэрагу вялікіх і малых праектаў. Найбольш значныя з іх былі прэзентаваныя на круглым стале. Дэпутаты давалі падрабязную справаздачу па выкананні грамадскіх ініцыятыў. У такіх справах, як той казаў, дробязяў не бывае. «МС», у сваю чаргу, перадае карысны досвед астатнім.**

Усё пачалося з праекта асацыяцыі «Эфектыўнае ўзаемадзеянне, сучаснае кіраванне — устойлівы вынік», які быў прафінансаваны пасольствам Каралеўства Нідэрланды ў Варшаве на агульную суму 10 000 еўра. Каб яго рэалізаваць, трэба было мабілізавацца ўсім дэпутацкім корпусам вобласці. Асацыяцыя разгледзела 11 ініцыятыў, якія мелі шанц быць прафінансаваны, але адбор прайшлі тры. Яшчэ дзве атрымалі так званы суцяшальны прыз. стар. 15


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Кожнаму закону – свой час



У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі, якія павінны быць патрабаванні да законапраектаў. стар. 3

### Памяць жыве...



Беларуская дэлегацыя ўдзельнічала ў памятных мерапрыемствах, прымеркаваных да 75-годдзя вызвалення лагера смерці ў Асвенцыме. стар. 2

### Галаўны боль капрамонту



Як праходзіць эксперымент у Мінску па капітальным рамонце жылых дамоў цэлымі кварталамі. стар. 2

### Попыт на рукі...



Якіх спецыялістаў больш за ўсё не хапае на Віцебшчыне і Брэстчыне? стар. 4, 14

### Шанц для беспрацоўнага,



або Як у Круглянскім раёне, што на Магілёўшчыне, працаўладкоўваюць насельніцтва. стар. 13

ВІЗІТЫ

# ПАМЯЦЬ АБ МІНУЛЫМ ГАРАНТУЕ БУДУЧЫНЮ

**Віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА ўзяў удзел у памятных мерапрыемствах, прымеркаваных да 75-годдзя вызвалення лагера смерці «Аўшвіц—Біркенау» ў Асвенцыме, а таксама абмеркаваў з польскімі калегамі пашырэнне міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.**

Анатоль Ісачанка ўзначаліў беларускую дэлегацыю, у склад якой увайшлі таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Рэспубліцы Польшча Уладзімір Чушаў, настаяцель храма-помніка Усіх Святых протаіерэй Фёдар Поўны.

Каля манумента вязням лагера смерці ў Асвенцыме адбылася цырымонія запальвання свечак. Анатоль Ісачанка размясціў памятную лампаду каля пліты абеліска «Беларуская».

На мерапрыемствах прысутнічалі дэлегацыі з 60 краін і міжнародных арганізацый. У якасці ганаровых гасцей сюды прыехалі каля 200 былых вязняў «Аўшвіц—Біркенау» з усяго свету, у тым ліку 13 з Беларусі. З імі пагутарыла беларуская дэлегацыя.

Таксама адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі дэлегацый Расіі, Казахстана, Арменіі, Грузіі.

У гэты ж дзень Анатоль Ісачанка ўзяў удзел ва ўрачыстай перадачы капсулы з зямлёй Асвенцыма кіраўніком горада Янушам Хверутам настаяцелю храма-помніка Усіх Святых протаіерэю Фёдару Поўнаму. Гэтая капсула будзе размешчана ў крыпце храма ў рамках міжнароднай акцыі памяці «У гонар агульнай Перамогі!»

Акрамя таго, у межах візіту прайшлі перагаворы беларускай дэлегацыі з адміністрацыяй Дзяржаўнага музея «Аўшвіц—Біркенау» наконт супрацоўніцтва з мемарыяльным комплексам «Трасцянец» і іншымі музейнымі ўстановамі Беларусі.

Як адзначыў Анатоль Ісачанка ў інтэрв'ю журналістам, Асвенцым — гэта знакавае месца для ўсіх людзей. «Канцлагер «Аўшвіц—Біркенау» — напамін усім жывым пра тое, што мы павінны зрабіць усё магчымае, каб тыя бяда і гора, якія тут адбыліся, ніколі больш не здараліся», — падкрэсліў ён.

* * *

## Віцэ-спікер Савета Рэспублікі правёў серыю сустрэч у парламенце Польшчы

Анатоль Ісачанка абмеркаваў перспектывы пашырэння беларуска-польскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння з віцэ-маршалам Сената Польшчы Габрыэлай Мараўска-Станецкай.

У гэты ж дзень адбылася сустрэча намесніка старшыні Савета Рэспублікі з віцэ-маршалам Сейма Польшчы Рышардам Цярлецкім, на якой разглядаліся магчымасці актывізацыі дыялогу дзвюх краін у розных сферах. Асаблівая ўвага была звернута на дзейнасць беларуска-польскай міжпарламенцкай групы.

* * *

## ... і наведаў Падляскае і Сілезскае ваяводствы

Падчас сустрэчы з падляскім ваяводам Багданам Пашкоўскім і маршалам Падляскага ваяводства Артурам Касіцкім Анатоль Ісачанка абмеркаваў пытанні ўзаемадзеяння на рэгіянальным узроўні. Размова пайшла пра развіццё трансгранічнага супрацоўніцтва дзвюх краін. З улікам таго, што Падляскае ваяводства з'яўляецца месцам кампактнага пражывання беларускай нацыянальнай меншасці (каля 38 тысяч чалавек), былі разгледжаны магчымасці падтрымкі беларускай культуры і мовы ў гэтым рэгіёне.

У рамках праграмы візіту намеснік старшыні Савета Рэспублікі наведаў вёску Заляшаны Падляскага ваяводства, дзе ўсклаў вянок да помніка беларусам, забітым атрадам Райса («Бурага») у 1946 годзе. У горадзе Гайнаўка Падляскага ваяводства Анатоль Ісачанка ўсклаў кветкі да помніка-абеліска савецкім салдатам, наведаў Музей і Цэнтр беларускай культуры. Акрамя таго, віцэ-спікер узяў удзел у цырымоніі збору зямлі для яе далейшага размяшчэння ў крыпце храма-помніка Усіх Святых у рамках Міжнароднай акцыі памяці «У гонар агульнай Перамогі!».

У Сілезскім ваяводстве Анатоль Ісачанка абмеркаваў з Ганаровым консулам Рэспублікі Беларусь у Катавіцэ Марэкам Расіньскім і прадстаўнікамі мясцовых бізнес-колаў шляхі нарошчвання міжрэгіянальнага супрацоўніцтва дзвюх краін у гандлёва-эканамічнай сферы.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# АДНОСІНЫ НЕАБХОДНА РАЗВІВАЦЬ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

## Актывізаваць двухбаковае супрацоўніцтва Беларусі і Вялікабрытаніі дапамогуць міжпарламенцкія кантакты

**Пра гэта ішла размова падчас сустрэчы спікера верхняй палаты беларускага парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Аб'яднанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Жаклін ПЕРКІНС, якая адбылася на мінулым тыдні ў Савеце Рэспублікі.**



Вітаючы госцю, Наталля Качанава адзначыла, што Беларусь заўсёды разглядала Вялікабрытанію як краіну, з якой у нас складваюцца добрыя стасункі. Апошнім часам інтэнсіфікаваўся двухбаковы палітычны дыялог, а таксама гандлёва-эканамічныя адносіны, што вельмі важна, падкрэсліла яна. «Гэта сведчыць пра тое, што ў нашых краін ёсць патэнцыял да ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва», — звярнула ўвагу спікер беларускага парламента.

Калі звярнуцца да лічбаў, то за 11 месяцаў 2019 года агульны тавараабарот склаў 2,4 мільярда долараў, з іх экспарт — 2,2 мільярда, імпарт — 0,3 мільярда долараў. Сальда, як бачым, станоўчае — 1,9 мільярда. Што мы пастаўляем? Большай часткай гэта нафтапрадукты, азотныя ўгнаенні, металаканструкцыі, мэбля і іншыя тавары. А завозім рухавікі ўнутранага згарання, аўтамабілі, часткі для іх і трактароў, лекі, марожаную рыбу.

Дарэчы, Аб'яднанае Каралеўства займае другую пазіцыю (пасля Расіі) па аб'ёме прыцягнутых у беларускую эканоміку прамых замежных інвестыцый. Гэтая лічба за тры леташнія кварталы склала 1,4 мільярда долараў. У нашай краіне створана 211 арганізацый з брытанскім капіталам.

— Мы разлічваем на тое, што нашы добрыя стасункі будуць працягнуты і ў дзелавой, і ў палітычнай, і ў міжпарламенцкай сферы, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Патэнцыял для далейшага супрацоўніцтва ў нас вялізны.

Важным, на яе думку, з'яўляецца і наладжаны дыялог паміж парламентарыямі. У парламенце Беларусі дзейнічае міжпарламенцкая група па сяброўства, якую ўзначальвае член Савета Рэспублікі Алег Румо. У 2017-м упершыню адбыўся візіт дэлегацыі парламента Вялікабрытаніі ў нашу краіну, і беларускі бок разлічвае на працяг такіх кантактаў.

— Гэта вельмі важна, бо парламентары могуць многае, у тым ліку інтэнсіфікаваць адносіны, якія сёння выбудоўваюцца ў палітычнай і эканамічнай прасторы, — упэўнена спікер Савета Рэспублікі.

Асобна яна падзякавала Аб'яднанаму Каралеўству за тую дапамогу, якая была аказана пасля трагедыі на Чарнобыльскай АЭС і датычылася аздараўлення беларускіх дзяцей у гэтай краіне: з той пары амаль 10 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак пабывалі ў Вялікабрытаніі.

— Гэта цудоўны прыклад супрацоўніцтва, — падкрэсліла яна. — Калі маладыя людзі бачаць, як жывуць у іншай краіне, адчуваюць добрае стаўленне — гэта сведчыць пра тое, што ў нашых адносін, безумоўна, ёсць будучыня.

У сваю чаргу, Жаклін Перкінс падзякавала за цёплы прыём і пагадзілася з тым, што двухбаковыя адносіны паміж краінамі маюць добрыя магчымасці для далейшага развіцця. На ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва, безумоўна, уплываюць і міжпарламенцкія кантакты, якія яна як дыпламат плануе актывізаваць у найбліжэйшай перспектыве. Для гэтага разглядаецца магчымасць арганізацыі візіту ў рамках адпаведнай групы дружбы членаў парламента Вялікабрытаніі ў Беларусь, каб замацаваць і яшчэ больш пашырыць гэтыя кантакты.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота БелТА.**

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# Як «зняць» галаўны боль капрамонту?

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ азнаёміўся з ходам капітальнага рамонту жылых дамоў сталіцы.**

У Фрунзенскім раёне, дзе пабываў сенатар, летась істотна перавыканалі план па капітальным рамонце жылля. Сяргей Рачкоў пабываў у дамах № 19 і 25 на вуліцы Бурдзейнага, № 84 і 82 на вуліцы П. Глебкі, пагаварыў і з будаўнікамі, і з людзьмі. У цэлым жыхары сур'ёзных прэтэнзій наконт якасці капрамонту не выказвалі. Так, былі заўвагі па тэрмінах работ (будаўнікі не заўсёды ўкладваюцца ў планы), задаваліся пытанні па добраўпарадкаванні тэрыторый, афармленні і рамонце фасадаў, іх уцяпленні і гэтак далей.

> У Мінску працягваецца эксперымент па капітальным рамонце жылых дамоў цэлымі кварталамі. Пад яго трапілі групы дамоў на тэрыторыі Заводскага, Савецкага, Фрунзенскага і Цэнтральнага раёнаў.

Тыя, каму давялося перажыць капітальны рамонт шматкватэрнага дома ў вялікім горадзе, добра ведаюць, які гэта шматмесячны галаўны боль. Зняць яго спрабуюць рознымі спосабамі. У Фрунзенскім раёне, напрыклад, думаюць пра пераход да так званага частковага капрамонту, пры якім рамантуюць асобныя ўжо зношаныя сістэмы дамоў. Але гэта ў тым выпадку, калі дом у асноўным знаходзіцца ў нармальным стане і тэрмін яго капрамонту яшчэ не надышоў. Сёлета ў пяці такіх дамах намечаны рамонт толькі балконаў, яшчэ ў чатырох пакуль заменяць сістэму водазабеспячэння.

У Мінску працягваецца эксперымент па капітальным рамонце жылых дамоў цэлымі кварталамі. Пад яго трапілі групы дамоў на тэрыторыі Заводскага, Савецкага, Фрунзенскага і Цэнтральнага раёнаў. Па конкурсе на кожную такую групу дамоў вызначаецца адна праектная арганізацыя. У далейшым прадугледжваецца распрацоўка праектных рашэнняў па добраўпарадкаванне дваровай тэрыторыі ў межах капітальна адрамантаваных дамоў.

Як кажуць спецыялісты, у такога падыходу ёсць некалькі пераваг. Ён дазваляе падняць якасць планавання капітальнага рамонту, палепшыць цэласнасць праектных рашэнняў, павысіць камфорт для ўладальнікаў або наймальнікаў жылля. Пры гэтым скарачаюцца тэрміны работ, можна таксама разлічваць на добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый.

Усяго ў 2020 годзе ў Мінску плануецца ўвесці каля 1,4 мільёна «квадратаў» жылля пасля капрамонту, што на 447 тысяч больш, чым летась.

**Па матэрыялах інфармагенцтваў «Мінск-Навіны» і БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# КОЖНАМУ ЗАКОНУ — СВОЙ ЧАС

## Праекты мусяць быць прапрацаваныя, запатрабаваныя і зразумелыя



**Строгія патрабаванні да фармулявання праектных прапаноў, абавязковае грамадскае абмеркаванне, канстытуцыйная адпаведнасць законаў і прагназаванне наступстваў іх прыняцця. Гэтыя і іншыя акалічнасці на шляху ператварэння ідэі ў закон абмяркоўваліся ў Палаце прадстаўнікоў. План падрыхтоўкі законапраектаў на 2020 год прадугледжвае распрацоўку 27 дакументаў, пяць з якіх складаюць бюджэтны пакет, а чатыры — канцэпцыі будучых законаў.**

### У грамадскасці цікавяцца

— Пры распрацоўцы плана падрыхтоўкі законапраектаў разглядаюцца прапановы суб'ектаў права, заканадаўчай ініцыятывы, дзяржорганаў і іншых арганізацый, у тым ліку навуковых і грамадскіх аб'яднанняў, якія выконваюць функцыі па абароне інтарэсаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання ў пэўнай сферы, — расказаў **Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.** — Пры фарміраванні праекта плана на 2020 год запыты былі накіраваны прыблізна 50 адрасатам. Паступіла каля 90 прапаноў.

Для прыцягнення грамадскасці ў нарматворчы працэс на прававым форуме краіны змяшчаецца інфармацыя аб пачатку работы па падрыхтоўцы праекта плана. Летась для грамадскага абмеркавання апублікавалі больш за 170 праектаў.

У праект плана рэкамендуецца ўносіць найбольш неабходныя і запатрабаваныя грамадствам законапраекты. У прыватнасці, забаронена змяняць нарматыўныя акты раней чым праз год пасля прыняцця або ўнясення ў іх апошніх змен.

— Строгія патрабаванні да фармулявання праектных прапаноў маюць свой вынік. Яны становяцца ўсё больш прапрацаваныя. Летась, напрыклад, каля паловы прапаноў было ўлічана, хоць раней больш за 60 % іх адхіляліся, — удакладніў Вадзім Іпатаў. — Усе няўлічаныя прапановы з абгрунтаваннем і ўказаннем прычыны адхілення яшчэ раз прапрацоўваюцца ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

### Каб закон не парадзіў... злачынства

Беларусь стала першай дзяржавай на прасторы СНД, у заканадаўства якой была ўведзена крыміналагічная экспертыза. Гэтая працэдура — асобны самастойны этап заканатворчай дзейнасці.

— Толькі на пачатку XXI стагоддзя прававеды зразумелі, што весці барацьбу са злачыннасцю, у тым ліку з карупцыяй, можна на ранніх стадыях. На ўзроўні заканатворчай работы можна здымаць недахопы, якія ўтрымліваюцца ў нормах, бо яны параджаюць пэўны правакатыўны эфект, даюць магчымасць для супрацьпраўнай матывацыі, — расказаў **Васіль МАРЧУК, дырэктар Навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры.** — У будучым гэта можа прывесці да злачынстваў і парушэнняў, таму такая мера мае важны прэвентыўны эфект. З 2007 года праз ведамства прайшло больш за шэсць тысяч прававых актаў.

Каб не дапусціць негатыўных наступстваў ад новых нормаў, з 2008 года ў Беларусі існуе абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх законапраектаў.

— Значэнне абавязковага канстытуцыйнага кантролю выцякае з ёмкай формулы «канстытуцыя жыве ў законах», — заўважыла **Наталля КАРПОВІЧ, намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда.** — Перш чым патрабаваць добрасумленнага выканання закона, трэба найперш забяспечыць такую яго якасць.

Перш-наперш правяраецца замацаванне ў законе дастатковых механізмаў для рэалізацыі правоў і свабод грамадзян. Яшчэ адзін крытэрый канстытуцыйнасці закона — выразнасць яго нормаў. Закон павінен быць зразумелы і даступны, каб выконваць яго было лёгка і ў поўнай адпаведнасці з закладзеным у яго сэнсам. Не менш важны аспект — суразмернасць устаноўленых законам абмежаванняў, якія не павінны парушаць межы, вызначаныя артыкулам 23 Канстытуцыі.

Дэпутаты разам са спецыялістамі абмеркавалі таксама іншыя праблемныя пытанні, якія ўзнікаюць падчас выкарыстання на практыцы заканадаўчых змен. Напрыклад, негатыўны ўплыў на бізнес частых паляпшэнняў умоў яго дзейнасці.

— Асабліва адчувальныя для бізнесу сферы неабходна перагодзіць на ўзровень законаў, — канстатаваў **першы намеснік міністра юстыцыі Сяргей ЗАДЗІРАН.** — Яшчэ адна праблема — наяўнасць некалькіх заканадаўчых актаў па адных і тых жа пытаннях. Усе карэктуемыя акты аднаго віду павінны змяняцца адначасова. А існаванне ў законах вялікай колькасці адсылачных нормаў пазбаўляе сістэму стабільнасці і празрыстасці.

Дэлегуючы мясцовым органам улады пэўныя паўнамоцтвы, неабходна вызначаць, на якім узроўні (абласным, раённым, гарадскім) яны павінны рэалізоўвацца, каб не атрымаць з розных рэгіёнаў разнастайныя рашэнні і, адпаведна, павялічаную колькасць нарматыўных актаў. Павінна быць максімальная аднастайнасць у іх рэалізацыі па ўсёй краіне, працягнуў Сяргей Задзіран:

— Адбываецца пэўны дысбаланс і ў дачыненні да рэалізацыі асобных нормаў па грамадзянах. Часам рашэнні органаў мясцовага кіравання фарміруюць заканадаўствам у цэнах і тарыфах на паслугі, што аказваюцца насельніцтву, якія ў розных абласцях і рэгіёнах адрозніваюцца ў некалькі разоў. А ў законах няма нават першасных адсылак, як разлічваць кошт сацыяльных паслуг і на што арыентавацца. Гэта перавозка пасажыраў і багажу, паслугі лазні, аплата пражывання ў інтэрнатах і іншае.

Каб стварыць зразумелую і празрыстую прававую сістэму, Мінюст збіраецца кансалідаваць акты Прэзідэнта і ўрада і нават разважае наконт прымянення механізму рэгулятарнай гільяціны. Апошні інструмент дазволіць выдаліць з прававога поля адмерлыя нарматыўныя прадпісанні, якімі ўжо не карыстаюцца, бо яны страцілі сваю актуальнасць, аднак пакуль не адменены і тым самым ствараюць лішнюю таксічнасць для бізнесу.

**Ірына СІДАРОК.**

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# Звароты людзей — індыкатар работы ўлады

**На мінулым тыдні старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў прамую лінію і прыём грамадзян у Шчучыне, што на Гродзеншчыне. Акрамя гэтага сенатар сустрэўся з калектывам СШ № 2 і пазнаёміўся з работай дыспетчарскай службы мясцовай ЖКГ.**



Разам з сенатарам у дыялогу з насельніцтвам удзельнічалі старшыня раённага Савета дэпутатаў Ганна Хвядзюк, намеснікі старшыні райвыканкама.

Адно з пытанняў датычылася замацавання на заканадаўчым узроўні права на дапамогу па доглядзе інваліда 1-й групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту і патрабуе пастаяннага догляду, асобамі, старэйшымі за 65 гадоў — мужчынамі, за 60 гадоў — жанчынамі. Віктар Лісковіч растлумачыў, што Гродзенскім аблвыканкамам былі накіраваны прапановы ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны аб зменах існуючага заканадаўства. У выніку разгляду ініцыятыва мясцовай улады не была падтрымана. На думку сенатара, важна знайсці варыянты задавальнення абгрунтаваных пажаданняў грамадзян. Таму ў найбліжэйшы час профільнае міністэрства будзе паўторна накіраваны запыт аб вырашэнні праблемы.

Намесніка старшыні райсавета ветэранаў Васіля Жукоўскага цікавіла, як будзе развівацца гарадскі пасёлак Астрына, уключаны ў комплексную праграму па добраўпарадкаванні і развіцці малых населеных пунктаў. Падчас прыёму было адзначана, што сёлета плануецца зрабіць паглыбленне рэчышча ракі Астрынка, завяршаецца рамонт дахаў гарбальніцы, былога ўнівермага і пошты. У распрацоўцы знаходзіцца праектна-каштарысная дакументацыя па рамонце сярэдняй школы. У планах добраўпарадкаванне цэнтральнай часткі гарадскога пасёлка.

Мужчына таксама пацікавіўся ў сенатара, як будуць вырашацца пытанні фарміравання цэн на лекі, асабліва на замежныя. Віктар Лісковіч паведаміў, што ў парламенце разглядаецца новы законапраект, пасля прыняцця якога насельніцтва адчуе істотныя зрухі, і адбудзецца гэта сёлета.

Падводзячы вынікі дыялогу з насельніцтвам, старшыня профільнай камісіі адзначыў важнасць пастаяннага ўзаемадзеяння з людзьмі:

— Тут павінен дзейнічаць выяўляльны прынцып. Гэта дасць магчымасць даведвацца пра тыя пытанні і праблемы, якія іх хвалююць, аператыўна прымаць упраўленчыя рашэнні па іх выкананні. Звароты грамадзян — індыкатар работы органаў улады. У любой сітуацыі, нават крытычнай, трэба паставіць сябе на месца чалавека, паглядзець на праблему яго вачыма. Калі правільна выбудаваць работу ў гэтым кірунку, то звароты грамадзян паменшаюць у разы, — упэўнены сенатар. — Важна ведаць праблемы людзей, знаходзіць шляхі іх вырашэння і праўдзіва расказваць, што для гэтага робіцца.

Ён падкрэсліў, што розным галінам улады неабходна актыўна ўзаемадзейнічаць у вырашэнні людскіх пытанняў. Дэпутаты павінны прасоўваць інтарэсы выбаршчыкаў у розных структурах, спрыяць добраўпарадкаванню населеных пунктаў.

Па выніках прыёму грамадзян і прамой лініі ўсе агучаныя праблемы, просьбы і прапановы трапілі на кантроль. Дадзеныя адпаведныя даручэнні прадстаўнікам раённай улады, непасрэдным выканаўцам. На пытанні, узятыя на кантроль, грамадзянам дадуць пісьмовыя адказы ў замацаваныя заканадаўствам тэрміны.

У гэты ж дзень старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі абмеркаваў з кіраўніцтвам раёна некаторыя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Шчучыншчыны. Пасля гэтага сенатар наведаў службу «Адно акно», зацікавіўся магчымасцю стварэння адзінага цэнтра адміністрацыйных паслуг. Ён падкрэсліў неабходнасць інфарматызацыі работы гэтай службы і яе электроннага ўзаемадзеяння з іншымі органамі і структурамі, якія рэагуюць на звароты, запыты і патрэбы насельніцтва.

На сустрэчы з калектывам СШ № 2 сенатар паднялі пытанне аб новай сістэме аплаты працы бюджэтнікаў, папрасіў прысутных у зале агучыць свае меркаванне. Педагогі таксама цікавіліся ў Віктара Лісковіча, якія змены ў Кодэксе аб адукацыі, ці плануюцца заканадаўчыя акты па льготных прафесійных пенсіях, як будзе праходзіць інтэграцыя выпускных экзаменаў і ЦТ. Наогул размова пайшла пра выхаванне дзяцей, якіх мы павінны рыхтаваць да жыцця, арыентаваць прафесійна і навучыць любіць сваю зямлю так, каб кожны, хто атрымаў дыплом, вяртаўся на сваю малую радзіму з жаданнем зрабіць яе яшчэ лепшай і прыгажэйшай.

**Па матэрыялах шчучынскай раённай газеты «Дзянніца».**

# ЁСЦЬ ЖАДАННЕ — БУДЗЕ І РАБОТА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Нагадаем, што пры складанні падобнага спіса ўлічваюцца такія паказчыкі, як узровень зарэгістраванага беспрацоўя, доля беспрацоўных, якія шукаюць работу больш за год, каэфіцыент напружанасці на рынку працы, тэмпы росту колькасці занятых і некаторыя іншыя.

Самая напружаная сітуацыя на рынку працы да пачатку гэтага года, паўторымся, склалася ў Мінскай і Віцебскай абласцях. Так, у Мінскай вобласці праблемныя аказаліся дзевяць раёнаў з дваццаці двух: Бярэзінскі, Вілейскі, Капыльскі, Крупскі, Лагойскі, Маладзечанскі, Мядзельскі, Пухавіцкі і Слуцкі.

Падобная сітуацыя і на Віцебшчыне: таксама дзевяць, мякка кажучы, не зусім паспяховых у гэтым плане раёнаў — Бешанковіцкі, Глыбоцкі, Гарадоцкі, Мёрскі, Пастаўскі, Расонскі, Сенненскі, Талачынскі і Шаркаўшчынскі.

У Брэсцкай і Гомельскай абласцях налічваецца па тры праблемных раёны. Гэта Бярозаўскі, Іванаўскі і Лунінецкі (Брэстчына) і Добрушскі, Рагачоўскі і Хойніцкі раёны (Гомельшчына).

Не зусім звычайная сітуацыя склалася ў Магілёўскай вобласці, дзе разам з Дрыбінскім і Круглянскім раёнамі ў пералік трапіў горад Бабруйск з насельніцтвам 217 тысяч чалавек (дарэчы, ужо другі раз запар). Ну, а менш за ўсё праблем з працаўладкаваннем адчуваюць жыхары Гродзеншчыны, дзе ў пералік трапілі толькі Зэльвенскі і Свіслацкі раёны.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У цэлым узровень зарэгістраванага беспрацоўя па стане на 1 кастрычніка 2019 года склаў 0,3 % ад колькасці рабочай сілы. Але гэтая лічба датычыцца толькі тых, хто стаў на ўлік у службе занятасці. Так, па звестках Міністэрства працы і сацабароны, усяго за студзень—кастрычнік мінулага года ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па садзейнічанне ў працаўладкаванні звярнулася 158,8 тысячы беларусаў. З іх у якасці беспрацоўных былі зарэгістраваныя толькі 80,4 тысячы чалавек. Разам з тымі, хто ўжо стаяў на ўліку на 1 студзеня 2019 года, у працаўладкаванні, па афіцыйных звестках, мелі патрэбу 175,7 тысячы чалавек, з іх 92,9 тысячы беспрацоўных.

У той жа час калі разлічваць узровень беспрацоўя ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднай арганізацыі працы, то ён у Беларусі па стане на другую палову 2019 года склаў 4,4 % ад колькасці рабочай сілы. Такія звесткі прыводзіць Белстат, які раз на квартал выбарачна абследуе хатнія гаспадаркі. Пры гэтым беспрацоўнымі лічацца людзі, якія ў перыяд правядзення абследавання не мелі работы і займаліся яе пошукамі, звяртаючыся ў дзяржаўную або камерцыйную службу занятасці, у СМІ ці інтэрнэт або непасрэдна да адміністрацый прадпрыемстваў, работадаўцаў і г. д., выкарыстоўваючы асабістыя сувязі, або здзяйснялі крокі да арганізацыі ўласнай справы. І яшчэ адна ўмова павінна быць выканана для таго, каб чалавека можна было лічыць беспрацоўным: ён павінен быць гатовы прыступіць да работы на працягу тыдня. Такім чынам, у якасці беспрацоўных таксама можна ўлічваць пенсіянераў і студэнтаў дзённых аддзяленняў.

* * *

У пастанове ўрада № 921 ад 27.12.2019, у якой у якасці дадатку і быў апублікаваны пералік тэрыторый, дзе прысутнічае напружаная сітуацыя на рынку працы, таксама змешчаны план дзеянняў на 2020 год па стварэнні ўмоў для развіцця эканомікі.

У прыватнасці, там згадваецца падрыхтоўка законапраекта, паводле якога будуць павышаны памеры сацыяльных выплат для беспрацоўных грамадзян, што жывуць на тэрыторыях з гэтага пераліку, а таксама для беспрацоўных беларусаў, старэйшых за 50 гадоў. Акрамя таго, плануецца ўзяць пад асаблівы кантроль работу па садзейнічанні занятасці насельніцтва на такіх тэрыторыях і штоквартальна аналізаваць яе эфектыўнасць. У прыватнасці, сярод мер, якія дапамагаюць зняць напружанне ў сферы занятасці, спецыялісты называюць садзейнічанне перасяленню беспрацоўных і членаў іх сем'яў на новае месца жыхарства і работы з даваннем наймальнікам жылля, прафесійную падрыхтоўку і перападрыхтоўку беспрацоўных, арганізацыю аплатных грамадскіх работ, садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці беспрацоўных.

Паводле звестак Мінпрацы і сацабароны, усяго ў Беларусі ў лістападзе 2019 года было прынята на работу 50 276 чалавек, звольнена — 56 944. Суадносіны прынятых і звольненых работнікаў склалі 88,3 % (гэтыя звесткі не ўлічваюць мікраарганізацыі і малыя арганізацыі без ведамаснай падпарадкаванасці).

Варта таксама адзначыць, што пачынаючы з 2007 года працуе Агульнарэспубліканскі банк вакансій, размешчаны на партале Дзяржаўнай службы занятасці, які актыўна выкарыстоўваецца ўсімі ахвотнымі. Так, у студзені—лістападзе мінулага года на ім зафіксавана 15,2 мільёна наведванняў.

**Святлана БУСЬКО.**

# ПОПЫТ НА РУКІ...

**У Віцебскай вобласці, як і ва ўсёй краіне, няма праблемы знайсці сабе работу. Ёсць вялікі попыт на рабочых, працаўнікоў сельскай гаспадаркі, кіроўцаў.**

Зразумела, стварэнне новых рабочых месцаў — адзін з лакаматываў развіцця эканомікі. Гэта і падаткі, і магчымасць спыніць адток высокакваліфікаваных спецыялістаў. За кошт стварэння новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў за 2016—2018 гады вобласць перавыканала заданне па працаўладкаваных больш чым на тры тысячы чалавек.

Летась дапамаглі знайсці работу 6,5 тысячы чалавек, за бягучую пяцігодку — 32 тысячам.

Дарэчы, цікавы «дысананс» па тэме стварэння новых рабочых месцаў. У інтэрнэце актыўна абмяркоўваюць запалкавую тэму: і сумуюць, і жартуюць наконт закрыцця з-за стратнасці вытворчасці запалак у Пінску. І манапалістам часова стане славуты барысаўскі вытворца. Але нядоўга, бо на Віцебшчыне з'явіцца канкурэнт. Інвестар з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў плануе толькі на першым этапе рэалізацыі праекта ўкласці тры мільёны долараў у выраб запалак у Паставах. Выгадныя ўкладанні, бо працаваць можна ў рамках ільгот свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск». Каля трыццаці чалавек атрымаюць рабочыя месцы. Плануецца ў асноўным экспартаваць тавар у краіны афрыканскага кантынента.

Дарэчы, нядаўна ў зоне зарэгістраваны 49-ы рэзідэнт. Як паведаміў **кіраўнік адміністрацыі СЭЗ «Віцебск» Міхаіл СКУРАТ**, навічок — з айчынным капіталам — прыватнае будаўнічае ўнітарнае прадпрыемства «Лінія зносу», якое будзе рэалізоўваць інвестыцыйны праект па зборы і перапрацоўцы другасных матэрыяльных рэсурсаў з наступным выкарыстаннем іх у будаўнічай галіне. Пад размяшчэнне вытворчасці абрана пляцоўка ў Оршы.

Рэалізацыя гэтага інвестыцыйнага праекта будзе спрыяць выкананню праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Аршанскага раёна да 2023 года (у рамках Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 506).



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І ўсё больш ёсць прыкладаў адкрыцця там унікальных прадпрыемстваў. Для стварэння ўмоў фарміравання лагістычнага патэнцыялу і павышэння транзітнай прывабнасці вобласці ў гарадскім пасёлку Балбасава працуе адзін з найбуйнейшых у краіне аўтамабільных тэрміналаў «Брэміна-Орша». І яго паэтапнае развіццё з будаўніцтвам і пашырэннем маштабаў дзейнасці вельмі актыўна працягваецца. Ён стане адным з найбуйнейшых у Еўропе.

У Аршанскім раёне пачаў працаваць і цэх перапрацоўкі соі. А з прыцягненнем тэхналогій адной з ізраільскіх кампаній гарантавана паспяховым будзе функцыянаванне свінарэпрадуктара на пяць тысяч галоў свінаматак паблізу вёскі Гараны. Аналагічны — у Лёзненскім раёне...

Што датычыцца ўплыву на эканоміку і рынак працы малога і сярэдняга бізнесу, то ён забяспечвае чацвёртую частку бюджэту. Яго ўнёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці няўхільна расце. Сёння на тэрыторыі вобласці працуе больш за 31 тысячу суб'ектаў прадпрымальніцтва. Іх колькасць летась вырасла на тысячу. Пачалі дзейнасць каля 280 новых малых арганізацый і каля 20 вытворчасцяў, дзе створана амаль 1400 новых рабочых месцаў.

У Прыдзвінні ўжо нямала прыкладаў, калі ствараюцца вытворчасці, якія даюць магчымасць актыўней развівацца прадпрыемствам. Напрыклад, на «Віцебскіх дыванах» арганізавалі ўласную вытворчасць поліпрапіленавых нітак. Прадпрыемствам «Віцебскэнерга» ўведзены ў эксплуатацыю цэх замарозкі ягад, агародніны і грыбоў. Рэалізоўваецца праект па замарозцы бульбы Талачынскім кансервавым заводам. Датэрмінова здадзены Віцебскай бройлернай птушкафабрыкай зернесушыльны комплекс з ёмістасцямі для захоўвання ў прыгранічным з Расіяй гарадскім пасёлку Сураж.

Кіраўнікам райвыканкамаў губернатар Мікалай Шарснёў паставіў задачу: асабіста браць удзел у прыцягненні інвестараў, а значыць, у стварэнні новых рабочых месцаў, якія будуць адпавядаць патрэбам часу. Адпаведны і клопат старшынь райсаветаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Тэлесеткі

# У БЕЛАРУСЬ ПРЫЙШОЎ X-FACTOR

**Айчынную версію аднаго з самых папулярных у свеце талент-шоу прадставіць Белтэлерадыёкампанія. Паводле слоў кіраўніка медыяхолдынга Івана Эйсманта, кантракт з брытанскімі праваўладальнікамі быў падпісаны некалькі тыдняў таму.**

Больш за тое, ужо абвешчаны старт нацыянальнага кастынгу для будучых удзельнікаў, які пройдзе ў сталіцы і абласцях, — у сакавіку—красавіку сустрэчы з прэтэндэнтамі плануюцца ў 10—12 гарадах. Прайсці адбор можна будзе як вочна, так і віртуальна: арганізатары абяцаюць прымаць відэазаяўкі праз сайт tvr.by.

Шанцы запаліць сваю зорку на музычным небасхіле ўдзельнікі атрымаюць у чатырох катэгорыях: дзяўчаты ад 16 да 24 гадоў, хлопцы ад 16 да 24 гадоў, выканаўцы ад 25 гадоў і старэйшыя, вакальныя калектывы. А вось хто зойме месцы ў журы, пакуль сакрэт.

Цікавыя лічбы: за шаснаццаць гадоў існавання талент-шоу з поспехам прайшло ў 56 краінах свету, а яго сукупная тэлеаўдыторыя пераўзышла 500 мільёнаў гледачоў. Беларусы ўбачаць свой X-Factor у эфіры ўжо гэтай восенню.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**




## ШАШКІ
(«Звязда») Выпуск № 106

Міжнародныя федэрацыі IDF і FMJD апублікавалі сусветныя шашачныя рэйтынгі па стане на 1 студзеня 2020 года.

У шашках-100 мужчынскі рэйтынг-ліст узначаліў беларускі гросмайстар Андрэй Валюк, на другім месцы дзеючы чэмпіён свету і Еўропы Ігар Міхальчанка. У жаночым рэйтынгу чэмпіёнка Еўропы Вера Хвашчынская займае трэці радок, у дзясятцы яшчэ два гросмайстры з Беларусі — Дар'я Федаровіч сёмая, чэмпіёнка свету 2019 года Яна Якубовіч на восьмым месцы. Чатырохразовы чэмпіён свету Анатоль Гантварг і міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч — на шостым радку мужчынскага і жаночага рэйтынгаў адпаведна.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя шашачнымі кампазітарамі з Украіны і Арменіі. Першыя дзве кампазіцыі склаў Анатоль Баланюк (горад Цэпладар Адэскай вобласці).



№ 12

**Белыя простыя шашкі:** a1, g1, f2, a3, b4, h4, a5 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** g3, d4, d6, e7, b8, d8 (6).

№ 13

**Белыя простыя шашкі:** a1, e1, d2, f2, a3, g3, d4, f4, g5 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, h4, d6, f6, c7, e7, b8, h8 (8).

Тры наступныя даслаў Ншан Алавердзян з Ерэвана.

№ 14

**Белыя простыя шашкі:** g1, b4, a5, g5, f6, h6 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, h2, d4, e5, d6, c7, f8 (7).

№ 15

**Белыя простыя шашкі:** b2, d4, f4, g5, g7 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, c3, e7 (3).

№ 16

**Белыя простыя шашкі:** c3, b4, c5, b6, дамкі: a7 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** g3, g5, e7, g7, дамкі: f2 (5).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Наш чытач Уладзімір Бандарык запрашае аматараў шашак на турнір па перапісцы, даведкі па тэлефоне +37517 501 50 34.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 105 ад 17.01.20.

Яны, дарэчы, у раёне вялікія — хапае незадзейнічаных вытворчых аб'ектаў, участкаў для вядзення бізнесу.



Старшыня райвыканкама Сцяпан ПАЛОННІКАЎ і яго намеснік Анжэла ЛУКАШЭВІЧ абмяркоўваюць перспектывы па развіцці раёна.



Сакратар камісіі Настасся ЦІШЧАНКА дэманструе, як вядзецца ўлік беспрацоўных Круглянскага раёна.

— Заклікаем незанятае насельніцтва пачынаць сваю справу і браць субсідыю на яе пачатак, — кажа старшыня райвыканкама. — І попыт ёсць. У нас адкрылі абутковую майстэрню, ёсць ахвотныя ўзяць дапамогу на развіццё асабістай падсобнай гаспадаркі. На гэтую пазыку рэальна купіць некалькі кароў. А яшчэ актыўна шукаем інвестараў. У нас ёсць два цікавыя інвестыцыйныя праекты. Частка Круглянскага раёна — гэта лясы і балоты, — нацыянальная экалагічная заказнікі. І мы будзем рады інвестару, які створыць у нас вытворчасць па шокавай замарозцы грыбоў і ягад. Другі праект, які мы рэкламуем, — будаўніцтва фермы па вытворчасці мяса індычкі. Для гэтага ў нас ёсць вельмі добрая пляцоўка.

У раёне таксама шукаюць выхады на міжнародны ўзровень. Нядаўна рэгіён стаў членам Беларускай грамадскай арганізацыі «Парадннёвыя гарады».

— Тое, што мы сталі паўнавартаснымі членамі гэтай арганізацыі, адкрывае перад намі добрыя перспектывы для развіцця. У сакавіку паедзем у Брэст на сустрэчу гарадоў-пабрацімаў Беларусі і Германіі. А ў красавіку плануецца сустрэцца з расіянамі ў Жодзіне, — удакладняе **намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях Анжэла ЛУКАШЭВІЧ.**

— Унутраныя рэзервы ў нас ёсць, але раён мала хто ведае, — дадае Сцяпан Палоннікаў. — Задзейнічаем усе сферы — і культурныя, і абмен школьнікамі, і розныя іншыя. Будзем выходзіць са сваім фестывалем «Свята лялькі» на абласны ўзровень. Тры гады таму да нас прыязджалі ўсяго адзін-два раёны, а летась было ўжо 14. Гэты кірунак у нас развіваецца як рамесніцтва — спрабуем рэалізоўваць такія вырабы. Тут задзейнічаны і інваліды. Шчыльна працуем над стварэннем новых рабочых месцаў. Збіраемся адкрыць швейную вытворчасць у былым будынку спартыўнай школы. Ужо і патэнцыйны пакупнік ёсць. Летась, дарэчы, у нас былі створаны дзве вытворчасці па пашыве адзення.

### ПА КІМ ПЛАЧА РАБОТА

У раёне плённа працуе Камісія па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва пад кіраўніцтвам старшыні райсавета. Па словах **сакратара камісіі Настассі ЦІШЧАНКІ,** незанятых у эканоміцы раёна 1211 працаздольных чалавек. Існуе электронная база, дзе ёсць падрабязная інфармацыя па кожнага з іх — колькі дзяцей на выхаванні, якая ёсць маёмасць, чым займаецца. Нехта вучыцца, нехта ў дэкрэце, нехта хворы. Такія беспрацоўныя павінны прынесці пацвярджаючы дакумент, і іх вызваляць ад абавязку кампенсаваць дзяржаве выдаткі. З агульнай колькасці незанятых без уважлівых прычын — 681 чалавек: 404 жывуць у Круглым і 277 на сяле.

— У камісіі па садзейнічанні занятасці ёсць прадстаўнікі ўсіх нашых арганізацый — 23 спецыялісты, — расказвае Настасся. — Да кожнага беспрацоўнага падыходзім індывідуальна, высвятляем, якую мае спецыяльнасць, дзе працаваў і колькі, за кошт чаго жыве, ці ёсць праблемы са здароўем. І работа падбіраецца з улікам усіх гэтых абставін. Камісія таксама перыядычна выязджае на вёску. Нядаўна, напрыклад, працавалі ў Комсенічах. Карысную інфармацыю аб рабоце размяшчаем на сайце, даём кансультацыі па тэлефоне. Але часта бывае, што сам чалавек не зацікаўлены працаваць. Вось, напрыклад, праводзілі пасяджэнне на базе гаспадаркі «Друць-Агра», запрашалі 34 чалавекі, а прыйшлі толькі шэсць.

Людзей таксама папярэджваюць аб адказнасці: калі яны не працаўладкуюцца або не прынясуць дакументы, дзе будзе ўказана ўважлівая прычына іх бяздзейнасці, ім з 1 мая давядзецца кампенсаваць камунальныя паслугі па эканамічна абгрунтаваных цэнах. Патэнцыйна ў спіс могуць трапіць 68 чалавек, якім пагражае стапрацэнтная кампенсацыя выдаткаў па цяпле, і сем чалавек, якіх чакае тое ж самае па газе.

Але некаторых такія перспектывы зусім не пужаюць. Нават на сяле стала модна не працаваць. А работы, як сведчаць суразмоўцы, там болей чым хапае. У асноўным на фермах, у калгасах, можна займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю або трымаць уласную гаспадарку — было б жаданне працаваць. Але гэта ў дэфіцыце. У Цяцерынскім сельсавеце, напрыклад, 46 такіх беспрацоўных.

— Усе яны могуць працаўладкавацца, але нават на разавыя грамадскія работы не жадаюць выходзіць, быццам ім грошы не патрэбны, — абурaецца **старшыня сельсавета Надзея ЯРОМІНА.** — Людзі з турмы прыйшлі, іх працаўладкавалі, а яны два тыдні папрацавалі і звольніліся.

***У Запрудскім сельсавеце*** беспрацоўных 22 чалавекі.

— Гэта адзін і той жа кантынгент, — у сэрцах кажа **старшыня сельсавета Святлана ФРАНЦУЗАВА.** — Раённая выязная камісія прыязджае, усіх беспрацоўных збіраем, падбіраем работу індывідуальна, а яны нос адварочваюць. Летась чалавек восем працаўладкавалі, але не факт, што яны надоўга затрымаюцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### Кампетэнтна

**Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Круглянскага райвыканкама Галіна МАЗОК:**

— Сёлета 1 студзеня на ўліку стаялі 25 грамадзян, з іх 19 беспрацоўных, пры наяўнасці 164 вакансій. Летась мы працаўладкавалі 375 чалавек, у тым ліку 242 з ліку беспрацоўных. На перанавучанне накіравалі 23 чалавекі, з якіх 19 непасрэдна пад заказ наймальніка. У грамадскіх работах узялі ўдзел 11 чалавек. Праводзім кірмашы вакансій, куды запрашаем і інвалідаў. Аказваем садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Летась сямі беспрацоўным адрасаваліся субсідыі на агульную суму 19,8 тысячы рублёў. На гэты год мы распрацавалі новыя кірункі работы па заахвочванні грамадзян працаваць. Сярод іх такія, як правядзенне акцый «Тыдзень занятасці», «Беспрацоўная маці», правядзенне спецыялізаваных кірмашоў для асоб з інваліднасцю і тых, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, арганізацыя на базе сельсаветаў выязных дзён «Малы бізнес на сяле».

# ВАКАНСІЙ — КАЛЯ ПЯЦІ СОЦЕНЬ

## Наваколле Белавежскай пушчы мае вялікую патрэбу ў рабочых руках і спецыялістах

**Спецыфіка Камянецкага раёна абумоўлена яго геаграфічным становішчам. Блізкасць мяжы з Еўрасаюзам заахвоціла многіх працаваць менавіта за мяжой. Ну а пушчанскі край паўплываў на развіццё бізнесу ў сферах агратурызму, дрэваапрацоўкі, паслуг. Варта сказаць, што сярэдняя зарплата ў раёне — больш за тысячу рублёў — стала трэцім паказчыкам у вобласці пасля Брэста і Бярозы.**

**Гэта пры тым, што ў мясцовасці з насельніцтвам у 34 тысячы чалавек буйных прамысловых прадпрыемстваў няма зусім.**



Фота БелТА.

### Попыт на даярак, кіроўцаў, медыкаў

— Сельгаспрадпрыемствы, калі выстаўляюць вакансіі жывёлаводаў, указваюць зарплату аператараў машыннага даення прыкладна ў 1200 рублёў. І пры гэтым вакансіі пастаянна ёсць, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Людміла МІХАЛАЧКІНА.** — У сельскую мясцовасць патрабуюцца механізатары, кіроўцы, жывёлаводы. Сёння ўзровень механізацыі такі, што да кандыдатаў на гэтыя месцы выстаўляюцца сур'ёзныя патрабаванні ў тым ліку па стане здароўя. Скажам так: хто «засвяціўся» у нарколага, той медкамісію не пройдзе. Работнікі патрэбны надзейныя і адказныя. Аўтапарк мае патрэбу ў кіроўцах аўтобуса. Па-першае, допуск да работы прадугледжвае пэўную катэгорыю правоў, якая ёсць не ў кожнага. Але ж катэгорыю пры жаданні можна атрымаць. А вось рэжым работы, калі трэба ўставаць не проста рана, а вельмі рана альбо заканчыць работу часам позна ўвечары, задавальняе не кожнага. Таму вакансіі ёсць.

У раёне значыцца каля 170 вакансій медыцынскіх работнікаў, не хапае ўрачоў, медыцынскіх сясцёр і санітарак. Гэта не значыць, што ў медустановах няма каля дзвюх соцень спецыялістаў і работнікаў. Часам незапоўненыя аказваюцца палова стаўкі, чвэрць стаўкі таго ці іншага спецыяліста, але ж патрэба ў медыках ёсць заўсёды. Пастаянна на работу запрашае санаторый «Белая вежа». Там час ад часу не хапае кухонных работнікаў, мыйшчыкаў посуду, афіцыянтаў. Асабліва адчуваецца недахоп афіцыянтаў. Гэтая работа патрабуе фізічнай працы маладых людзей. І летам, калі з'язджаюцца дадому студэнты, многія з іх не супраць падпрацаваць, з задавальненнем уладкоўваюцца на работу ў санаторый: і ад горада блізка, і свежае паветра навокал. Зімой патрэба ўзнікае зноў.

На сельгаспрадпрыемствы патрабуюцца інжынеры, аграномы, заатэхнікі. Будаўнічыя арганізацыі маюць самыя розныя вакансіі рабочых у залежнасці ад аб'ёмаў будаўніцтва. Ёсць попыт на сезонную працу, напрыклад, у гаспадароў фермерскіх і сялянскіх гаспадарак. Усяго на сённяшні дзень значыцца 480 вакансій. А на ўліку ў службе занятасці на канец мінулага года было шэсць чалавек, цяпер лічба ўзрасла да дванаццаці, — падсумавала Людміла Міхалачкіна.

Летась у службу занятасці раёна звярнулася 369 чалавек. З іх 134 падыходзяць пад статус беспрацоўнага, бо на час звароту не мелі ніякага даходу, астатнія звярталіся па розных прычынах, напрыклад, студэнты альбо навучэнцы хацелі знайсці падпрацоўку, нехта меў жаданне памяняць работу. З названых 134 чалавек 106 атрымалі садзейнічанне ў працаўладкаванні, гэта значыць атрымалі накіраванне да канкрэтнага работадаўца.

### Работа камісіі

— На жаль, не ўсе накіраваныя даходзяць да прадпрыемства ці ўстановы ў прамым сэнсе слова, — уступае ў гаворку **старшыня пастаяннай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці, старшыня райсавета дэпутатаў Ірына НЕГІРЫШ.** — Ёсць асобная катэгорыя грамадзян, якія не працавалі і працаваць не збіраюцца. У ходзе работы камісіі мы праводзілі з імі самыя розныя гутаркі, некаторых, даволі маладых, здаровых, даводзілася дастаўляць на пасяджэнне з дапамогай міліцыі. Яны ўважліва выслухоўваюць сказанае, як правіла, не пярэчаць, пагаджаюцца з тым, што працаваць у прынцыпе трэба, а на канкрэтныя прапановы рабочага месца адказваюць, што будуць думаць. Думаюць, выходзіць, па сённяшні дзень.

Яшчэ адна катэгорыя не занятых у эканоміцы працуе... ад уладкавання да запою і звальнення. Такім мы дапамагаем, здараецца, па другім і трэцім разе. І толькі ствараем дадатковыя праблемы наймальнікам. Хто хоча працаваць, замацавацца на сваім месцы, той гэта робіць. Апошняе пацвярджаюць і факты працаўладкавання людзей, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. Тыя з іх, хто настроены на нармальнае жыццё і працу, адразу пачынаюць рабіць і ставяцца да сваіх абавязкаў адказна.

Старшыня камісіі адзначыла таксама, з якімі праблемамі камісія сутыкаецца і якія трэба вырашаць на заканадаўчым узроўні. Напрыклад, нямала людзей з раёна працуе за мяжой — у Польшчы, у Расіі. Варта выпрацоўваць механізмы іх уліку ў нашай статыстыцы. Яны ж у абсалютнай большасці з часам вяртаюцца, прывозяць грошы і ўкладваюць у нашу эканоміку. Пакуль што пацвердзіць сваю работу ў замежжы для нашага грамадзяніна вельмі складана. Патрабуецца прафесійны пераклад шэрагу дакументаў, усё гэта каштуе грошай, не ўсе маюць жаданне гэтым займацца. А да людзей трэба ставіцца больш уважліва, яны ў будучыні могуць прывезці не толькі сродкі, але і вопыт, навыкі, сувязі, каб пачаць сваю справу на радзіме і адкрыць новыя вакансіі.

### Новыя рабочыя месцы

Паводле слоў **намесніка старшыні райвыканкама Аляксандра МІХАЛЬЧЫКА**, у раёне летась з'явілася 12 новых мікра- і малых прадпрыемстваў, на новыя рабочыя месцы ўладкавана 72 чалавекі. Прыкладна палова рабочых месцаў створана ў сельскай мясцовасці. Скажам, ААТ «Белавежскі» адкрывае на адным са сваіх участкаў новую вытворчасць кармоў. Там адразу спатрэбілася шэсць працаўнікоў, якія атрымалі работу. «Традыцыйны кірунак цікавасці нашых прадпрымальнікаў — дрэваапрацоўка, кругом жа лес. Вось і летась у Навіцкавіцкім сельсавеце зарэгістравана ТАА «ДНКдрэў». На работу яны ўзялі шэсць чалавек, у тым ліку жанчын, бо вытворчасць прадугледжвае не асабліва цяжкую працу. Прадпрыемства выпускае еўрападдоны, пелетную дошку, шпон — прадукцыю, якая карыстаецца попытам за мяжой. З'яўляюцца невялікія транспартныя, гандлёвыя прадпрыемствы. Часта і новыя вытворцы адчуваюць недахоп рабочых рук. А тыя, хто працуе даўно і паспяхова, як, напрыклад, цэх «Санты», «Еўратрэйд», возяць работнікаў з Брэста», — кажа намеснік старшыні райвыканкама.

Яшчэ Аляксандр Пятровіч адзначыў у ліку асаблівасцяў раёна той факт, што тут добра развіваецца агратурыстычны бізнес. У гэтай сферы занятыя 136 чалавек, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам у вобласці. Так склалася гістарычна, што аграсядзібы сталі з'яўляцца менавіта ў прыпушчанскім краі. Многа едзе турыстаў, значыць, запатрабаваныя сувеніры. Таму тут зарэгістраваны 288 рамеснікаў. Але ж на Камянеччыне заўсёды чакаюць людзей ініцыятыўных, тых, хто гатовы ўкладваць інвестыцыі, ствараць новую вытворчасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Камянецкі раён.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в деревне Годылево Быховского района Могилевской области

| № лота | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Правовой режим | Срок аренды, лет | Целевое назначение земельного участка (назначения земельного участка в соответствии с единой классификацией) | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Могилевская область, Быховский район, д. Годылево, ул. Гасана | 721384401601000185 | 0,0140 | аренда | 30 | Для установки торгового павильона (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 33,80 | 3,38 |

Аукцион состоится 3 марта 2020 г. в 15.00. по адресу: Могилевская область, город Быхов, ул. Ленина, 37 (зал заседаний). Аукцион проводится в месте, день и час, указанные в извещении о проведении аукциона. Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников аукциона на лот.
Заявки принимаются с 03.02.2020 г. по 28.02.2020 г.
включительно по адресу: Могилевская обл., г. Быхов, ул. Ленина, 37, каб. 30, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 обед – с 13.00 до 14.00. Контактный телефон: 8 (02231) 79708, 78897.
Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться на местности с земельным участком.
Для участия гражданину, индивидуальному предпринимателю или юридическому лицу (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок необходимо: а) подать заявление об участии в аукционе; б) предоставить документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Быховского райисполкома BY67 AKBB 3641 0456 7038 3700 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал № 700 г. Могилев, код банка AKBBBY21700, код платежа 04002, УНП 700085027; в)заключить с Быховским районным исполнительным комитетом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Кроме того, в комиссию представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.
Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.
Условия предоставления земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
- внести в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения), за вычетом суммы задатка, на расчетный счет Быховского районного исполнительного комитета BY67 AKBB 3641 0456 7038 3700 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал № 700 г. Могилев, код банка AKBBBY21700, код платежа 04002, УНП 700085027; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения на расчетный счет Быховского районного исполнительного комитета BY67 AKBB 3641 0456 7038 3700 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал № 700 г. Могилев, код банка AKBBBY21700 , код платежа 04616, УНП 700085027 в сумме – 2065,24 руб.
- не позднее 2 рабочих дней после совершения вышеуказанных действий, заключить с Быховским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;
- обратиться за государственной регистрацией в отношении земельного участка в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка;
- обратиться за государственной регистрацией прекращения права землепользователя на земельный участок;
- приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него;
- снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его для благоустройства территории;
- до занятия земельного участка осуществить работы по наведению порядка на предоставленном земельном участке и его благоустройству в соответствии с требованиями земельного законодательства;
- обеспечить использование земельного участка в соответствии с целевым назначением.
Быховский районный исполнительный комитет

# ВЕЛАПАРКОЎКА, СВЯТА, СПАРТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Мы шукалі рэсурсы, каб рэалізоўваць палажэнні статута асацыяцыі, у прыватнасці такія, як развіццё ініцыятывы, стварэнне дзейснага механізма самакіравання, разнявольванне дэпутацкай дзейнасці. Адпаведна і да дэпутатаў былі патрабаванні, — растлумачыў **старшыня Чавускага райсавета, па сумяшчальніцтве старшыня абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН.** — Яны павінны былі прааналізаваць праблемы ў сваёй выбарчай акрузе і выявіць ініцыятыву, якая б была падтрымана насельніцтвам, у тым ліку фінансава. Перад тым як аб'явіць конкурс, мы вучылі дэпутатаў стратэгічнаму мысленню, уменню выяўляць праблемы, весці размовы з людзьмі. Асабліва гэта датычылася дэпутатаў-пачаткоўцаў. Чалавек быў спецыялістам у сваёй сферы, а тут у яго з'явіліся новыя абавязкі. Наша задача была яго навучыць. І не проста навучыць, а паказаць прыклад. Мы двойчы выстаўляліся на суісканне грантаў, разлічвалі, праўда, на большае, але пакуль не атрымалася. Але ў нас усё наперадзе. Увесь час мы звяртаем увагу на тое, што ў асацыяцыі ёсць рэсурсы, каб падтрымаць дэпутатаў, навучыцца прапаноўваць ідэі, праектаваць праблему, аблічваць сродкі на яе, заручацца падтрымкай людзей. У іншых краінах існуе такое паняцце, як бюджэт грамадзянскага ўдзелу. Гэта значыць, што ў мясцовага бюджэту ёсць сродкі, на якія могуць заявіцца грамадзяне і прапанаваць ініцыятыву. У нас крыху іншы падыход, але прынцып дзеяння такі ж.

> Воля, імкненне да перамогі, дасягненне мэты — усё гэта вельмі добра дапамагае дэпутату ў рабоце з насельніцтвам, у рэалізацыі ініцыятыў.

Летась Анатоль Мацюлін браў удзел у 80-й сесіі Камітэта па гарадскім развіцці, жыллёвым будаўніцтве і землекарыстанні Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН, якая прайшла ў Жэневе. Там таксама разглядаўся вопыт актыўнай супольнасці ў гарадскім маштабе, у тым ліку — тэма стварэння інфраструктуры для насельніцтва і з яго ўдзелам. Зоны адпачынку, велапаркоўкі, азеляненне — гэта ўсё складнікі камфортных умоў для жыцця чалавека ў любым канцы свету. Такія міжнародныя сустрэчы дапамагаюць карэктаваць сваю дзейнасць і наладжваць дзелавыя кантакты. У пошуках сродкаў пад карысныя ідэі магілёўская асацыяцыя набыла надзейных замежных партнёраў. Адзін з іх — Латвійскі цэнтр рэгіянальнага развіцця.

— Мы ўжо выязджалі да іх, а яны прыязджалі да нас, — расказвае Анатоль Мацюлін. — Вучымся ў іх арганізацыі работы з міністэрствамі, прынцыпу размеркавання сродкаў паміж раёнамі. У іх крыху іншы сэнс укладаецца ў слова «самакіраванне». Там пад ім разумеецца выканаўчая ўлада, а ў нас самакіраванне мае грамадскую форму. Але мэты адны і тыя ж — знайсці сацыяльна важную праблему і паспрабаваць яе вырашыць. Канешне, глабальныя праекты накшталт пабудовы станцыі абезжалезвання пакуль нам не пад сілу. Затое невялічкія праблемы, але не менш важныя для насельніцтва, мы здольныя вырашыць самастойна. Нашы фінансы складаюцца з членскіх узносаў, добраахвотных ахвяраванняў дэпутатаў і прыцягнутых грантаў. Гэта той рэзерв, які мы можам выкарыстоўваць на рэалізацыю адпрацаваных у раёнах ініцыятыў. Але яны павінны перад гэтым быць зацверджаны на сесіі рай- або гарсавета. Выдаткоўваць грошы на нешта стыхійнае неразумна — трэба, каб наша дзейнасць прыносіла відавочную карысць.



Астравок здароўя прыйшоўся жыхарам Горак даспадобы.

## Інклюзіўны падыход

Якімі патрэбамі жыве насельніцтва рэгіёна, чаго яму не хапае? Клічаўскі раён, напрыклад, атрымаў падтрымку асацыяцыі на адраджэнне і правядзенне свята ўраджаю «Багач». Аўтарам ініцыятывы выступіў дэпутат райсавета Уладзімір Суравец, дарэчы, дырэктар дзіцячай школы мастацтваў. У раёне вельмі моцныя культурныя традыцыі, і яго прапанова падчас старадаўняга свята правесці майстар-класы па вышыванні, лозапляценні і іншых рамёствах для людзей з абмежаванымі магчымасцямі была ўспрынятая станоўча. Генеральным партнёрам па рэалізацыі ініцыятывы стаў раённы Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. За донарскія сродкі мы набылі дзве швейныя машыны і два сталы. На мерапрыемства пазвалі гасцей і з суседніх раёнаў — Кіраўскага, Асіповіцкага і Бабруйскага. Інвалідам дапамаглі прыехаць на свята раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Карысць ад свята відавочная, — канстатуе **старшыня Клічаўскага райсавета дэпутатаў Уладзімір КНІГА.** — У людзей з абмежаванымі магчымасцямі з'явіліся нейкія новыя навыкі, магчыма, яны сябе знойдуць у новым сваім занятку і змогуць нават зарабіць на ім. Плюс карысны інвентар для нашых устаноў набылі. Адна швейная машынка засталася ў Доме рамёстваў, другая ў Доме культуры. Асацыяцыя нам у гэтай справе вельмі добра дапамагла. Праз яе мы знайшлі донара і скарысталіся паслугамі спецыяліста, які навучыў пісаць праекты. Сёння ў нас ёсць бясцэнны вопыт, як дзейнічаць у гэтым кірунку.

## Астравок здароўя

Выбаршчыкі Марыны Бандык з Горак падтрымалі ідэю стварэння ў адным з маладзёжных раёнаў горада спартыўна-забаўляльнай пляцоўкі. Для вырашэння праблемы яна сабрала ініцыятыўную групу з ліку прадстаўнікоў органаў мясцовага кіравання, самакіравання і грамадскасці, якую сама і ўзначаліла. Яшчэ да падачы заяўкі на сафінансаванне Марына і яе група арганізавалі і правялі дзесяць сходаў з жыхарамі мікрараёна Будаўнікоў, абмеркавалі і стварылі сумесны план дзеянняў. У выніку жыхары сабралі сваімі сіламі 1350 рублёў. З улікам дапамогі, якую ім аказала асацыяцыя, і валанцёрскай дзейнасці (якая, як вядома, бясплатная, але ж таксама мае сваю цану) праект абышоўся болей чым у дзве з палovай тысячы еўра. На гэтыя грошы былі набытыя і ўсталяваныя гульнявы комплекс для дзяцей малодшага ўзросту і спартыўны — для занятках падлеткаў фізкультурай і спортам, чатыры лаўкі для адпачынку, высаджана 180 саджанцаў кустоўя, аднаўленая альтанка, зроблена пясочніца для дзятвы, футбольнае поле з варотамі і агароджай у выглядзе сеткі, адрамантавана дзве пешаходныя дарожкі. Падчас рэалізацыі ініцыятывы прайшлі чатыры майстар-класы па занятках на спартыўным абсталяванні для мясцовых жыхароў, а таксама для школьнікаў сярэдняй школы № 4.

— Самае галоўнае, што пасля гэтага жыхары з іншых мікрараёнаў таксама выказалі сваю зацікаўленасць у сумесным вырашэнні падобных пытанняў, — кажа **старшыня Горацкага райсавета дэпутатаў Аксана АГАРОДНІКАВА.** — Яны звярнуліся да нас з прапановамі і гатоўнасцю ўдзельнічаць фінансава. Хочацца адзначыць, што вучоба, арганізаваная асацыяцыяй, аказалася вельмі прадуктыўная. Ініцыятыву падтрымалі не толькі гараджане, але і некаторыя арганізацыі горада. Натхнёныя, мы пачалі больш актыўна заахвочваць і сельскае насельніцтва. У выніку сумесна з жыхарамі вёскі Ходараўка рэалізавалі яшчэ адну ініцыятыву. У яе таксама былі ўкладзеныя грошы асацыяцыі.


Будаўніцтва велапаркоўкі добра згуртавала краснапальчан.

## Велапаркоўка для ўсіх

Вынікам работы **дэпутата Краснапольскага райсавета ад Савецкай выбарчай акругі № 7 Алены ДЗЯМ'ЯНАВАЙ** стала не толькі крытая велапаркоўка на 10 месцаў і адно спецыяльнае для дзіцячай каляскі, але і карта велапарковак усяго гарадскога пасёлка — цяпер яна размешчана на сайце райвыканкама. На рэалізацыю ініцыятывы пайшло 1124 еўра, з якіх амаль 225 атрымана ад краснапальчан, якія згуртаваліся ў дасягненні агульнай мэты. Партнёрамі ў рэалізацыі праекта выступілі раённы Савет дэпутатаў, аддзел па адукацыі, спорце і турызме райвыканкама, гарадскія і грамадскія службы і арганізацыі.

— Я перакананa, што дэпутаты ў цеснай узаемасувязі з органамі мясцовага тэрытарыяльнага самакіравання і пры падтрымцы выканаўчай улады заўсёды змогуць дамагчыся значных вынікаў, — падкрэсліла Алена Дзям'янава. — Сёння вельмі важна, каб нашы выбаршчыкі бачылі рэальную ўвагу з нашага боку да іх пытанняў і праблем. І толькі тады мы можам разлічваць, што яны таксама возьмуць актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні тэрыторыі каля свайго дому, сваёй вуліцы і раёна ў цэлым.

> Зоны адпачынку, велапаркоўкі, азеляненне — гэта ўсё складнікі камфортных умоў для жыцця чалавека ў любым канцы свету.

## Спорт дапамагае стаць ініцыятыўным

У асацыяцыі, як і ва ўсёй прадстаўнічай улады вобласці ў цэлым, ёсць яшчэ адно вельмі важнае прызначэнне — прапаганда здаровага спосабу жыцця. Існуе нават Палажэнне аб правядзенні летніх і зімовых спартакіяд сярод дэпутацкага корпуса. Зімовая, дарэчы, адбылася зусім нядаўна.

— Паколькі зіма затрымалася, мы замест лыжных гонак арганізавалі ў шклоўскім лядовым палацы шорт-трэк, — удакладніў Анатоль Мацюлін. — Спаборніцтвы праводзіліся два дні, кожны раён дэлегаваў па восем сваіх прадстаўнікоў. Было шмат станоўчых эмоцый, пазітыўных уражанняў. Такія мерапрыемствы вельмі дапамагаюць згуртавацца, вучаць працаваць на агульны вынік у складзе каманды. Воля, імкненне да перамогі, дасягненне мэты — усё гэта вельмі добра дапамагае дэпутату ў рабоце з насельніцтвам, у рэалізацыі ініцыятыў.

Дарэчы, пераходзячы кубак пераможцы і палатку ў падарунак атрымала каманда з Клічава, на другім месцы Чавусы, на трэцім — Касцюковічы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сайта Магілёўскай асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў і Краснапольскага райсавета.**

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»**, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | **ИУП «Эстейт Инвест»,** 223051, Минская обл., Минский р-н, п. Колодищи, ул. Промышленная, д. 16 |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов, реализуемый в составе одного лота**
**Месторасположение:** Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, промышленный узел «Колодищи»

Производственная база в составе: **административно-хозяйственное здание № 1** (600/С-89911, 24,1 кв. м), **административно-хозяйственное здание № 2** (600/С-89910, 39,3 кв. м), **административное здание № 3** (600/С-114025, 33,2 кв. м), **административное здание № 4** (600/С-114022, 41,7 кв. м), **административно-хозяйственное здание № 5** (600/С-114010, 60,1 кв. м), **производственный корпус № 1** (600/С-89909, 218,7 кв. м), **производственный корпус № 2** (600/С-51028, 6733,2 кв. м), **административное помещение производства С/П** (600/С-114023, 208,6 кв. м), **склад № 1** (600/С-771, 333 кв. м), **склад № 2** (600/С-770, 334 кв. м), **склад № 3** (600/С-767, 332 кв. м), **склад № 4** (600/С-95727, 341 кв. м), **склад № 5** (600/С-769, 333 кв. м), **бытовое помещение** (600/С-768, 63 кв. м), **ТП** (600/С-948, 54,5 кв. м), **временный бытовой корпус** (600/С-949, 268,8 кв. м), **ГРП** (600/С-950, 20,2 кв. м), **КПП № 2** (600/С-114024, 16 кв. м)

**Сведения о земельном участке:** участок пл. **6,0956 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов промышленности

**Начальная цена без НДС – 3 519 750 евро***

***Примечание: цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС 20 %**

**Обременения по лоту:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банка. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Задаток **1 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,5 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 04.01.2020 г.

**Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия**

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов – 04.03.2020 г. в 11.00.<br>Окончание торгов – 04.03.2020 г. в 12.00.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.03.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |



## Результаты Рекламной игры «Авто от Мастеркард. Декабрь»

**Организатор Рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

**Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Декабрь».**

Срок проведения Рекламной игры: в период с 1 декабря 2019 года по 4 февраля 2020 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения Рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3684 от 19.11.2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 19 ноября 2019 г.

В Рекламной игре приняло участие 130 655 физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель Рекламной игры «Авто от Мастеркард. Декабрь»

Главный приз № 1 – автомобиль KIA RIO FB, № кузова Z94C241AAKR137507 и денежные средства для уплаты налога в размере 3650,76 (три тысячи шестьсот пятьдесят) белорусских рублей 76 копеек

| № п/п | № Шанса | Номер карты | Ф. И. О. победителя | Населенный пункт |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 122 776 | 7083370095000760594 | Смирнов Андрей Александрович | г. Лида |

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно.


НАВАСЕЛЛЕ

# КАБ З ГАДАМІ ГАНАРЫЛІСЯ СВАЁЙ СЯМ'ЁЙ

## У Брэсце ўрачыста адкрылі новы дзіцячы дом сямейнага тыпу

**Гэта другі па ліку ў Ленінскім раёне дом. Ён узведзены на вуліцы Дуброўскай абласнога цэнтра. Бацькі Вольга і Сяргей БРУХ і дзевяць іх дзяцей прымалі гасцей, якія прыбылі на свята з віншаваннямі і падарункамі.**



Фота БелТА.

З ранку ў доме было поўна людзей, адчувалася напружанне, найбольш у асяродку дарослых. Дзеці ж паводзілі сябе спакойна, з задавальненнем ішлі на кантакт, паказвалі свае пакоі, новую мэблю, цацкі. Яны ўсяго два тыдні жывуць у новым доме, ідзе працэс адаптацыі да новых школы, садка, абстаноўкі і бацькоў.

Вольга і Сяргей маюць дваіх уласных дзяцей — адзінаццацігадовую Еву і паўтарагадовага Івана. Галава сям'і атрымаў педагагічную адукацыю, маці сямейства мае спецыяльнасць, звязаную са швейнай справай. Сужэнцы ўдзельнічалі ў конкурсе, прайшлі падрыхтоўку і сталі бацькамі вялікай сям'і. Цяпер тут выхоўваюцца пяцёра дзяцей з прозвішчам Савасцюк, а таксама сястрычкі Ангеліна і Вераніка Шакала.

Падчас урачыстага адкрыцця мама Вольга Вячаславаўна выказала намер акружыць дзяцей любоўю, клопатам і спадзяванне, што праз многа гадоў яны будуць ганарыцца сваёй вялікай і дружнай сям'ёй. Сяргей Аляксандравіч падтрымаў жонку, выразіў удзячнасць усім, хто ім дапамагаў на шляху да такога вялікага сямейнага дому, асобныя словы падзякі адрасаваў будаўнікам ААТ «Палессежылбуд».

**Дырэктар ПМК–82 гэтай арганізацыі Аляксей МАРОЗАЎ** агучыў агульны настрой усіх прысутных, калі пажадаў аддзелу адукацыі аб'яднаць у такіх сем'ях усіх дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, маме і тату — цярпення, добрых выхадных і няцяжкіх будняў, а дзецям — расці здаровымі і шчаслівымі.

А для гэтага будаўнікі зрабілі многае. Двухпавярховы дом плошчай 210 квадратных метраў атрымаўся светлы, прасторны, зручны. Бюджэту названы аб'ект абышоўся ў 394 тысячы рублёў.

**Першы намеснік старшыні Брэсцкага гарвыканкама Вадзім КРАЎЧУК,** які прыйшоў павіншаваць сям'ю са знамянальнай падзеяй, паведаміў, што за сем гадоў у горадзе ўзведзена восем дамоў сямейнага тыпу, у якіх выхоўваецца 46 дзяцей. Акрамя таго, 199 хлопчыкаў і дзяўчынак растуць у апякунскіх сем'ях, 29 — у прыёмных. «Задача органаў улады, грамадскасці, дэпутатаў усіх узроўняў — стварыць гэтым дзецям камфортны і ўтульны асяродак, забяспечыць умовы для выхавання і развіцця», — адзначыў Вадзім Краўчук. **Старшыня Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай КРАСОЎСКІ** пажадаў бацькам вялікай сям'і выхоўваць дзяцей свядомымі і адказнымі грамадзянамі сваёй краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

# Садок у доме

**У буйных гарадах Брэсцкай вобласці плануюць узводзіць жылыя дамы з убудаванымі дзіцячымі садкамі. Пра гэта паведаміў журналістам старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС.**

«Гэтая ідэя добрая для любога рэгіёна, але асабліва актуальная для вялікіх гарадоў. Перавага праекта ў тым, што ён забяспечвае крокавую даступнасць дашкольных устаноў адукацыі. У спальных мікрараёнах іх не хапае. Будаваць буйныя дзіцячыя сады — не заўсёды добрае выйсце, у тым ліку з-за вялікай колькасці дзяцей, — тлумачыць Анатоль Ліс. —



Фота БелТА.

Ва ўбудаваным жа дзіцячым садку ўсяго тры групы на 20 чалавек, прасторна. Ён будзе запатрабаваны».

Старшыня аблвыканкама звярнуў увагу, што пабудаваць дзіцячы садок у складзе жылога дома значна танней, чым асобна ўзводзіць установу адукацыі. Убудаваныя ў жылыя дамы дзіцячыя сады ў перспектыве плануюць пабудаваць у Брэсце, Баранавічах і Пінску.

У Драгічыне на гэтым тыдні адкрылі першы на Брэстчыне ўбудаваны дзіцячы сад. «У ім досыць плошчаў і неабходных памяшканняў, вытрымліваюцца ўсе стандарты. Праект пілотны. На базе гэтага дзіцячага садка будзе апрабацыя тэхналогіі: эксплуатацыя будынка, работа калектыву. Калі будуць з'яўляцца нейкія нюансы, будзем уносіць змены на стадыі праектавання новых аб'ектаў», — адзначыў **начальнік упраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама Юрый ПРАСМЫЦКІ.**

Наступным горадам, у якім з'явіцца ўбудаваны ў жылы дом дзіцячы садок, будзе Брэст. «Ужо цяпер разглядаем магчымасць перайначыць праект. Паколькі ў мікрараёне забудовы ёсць буйны дзіцячы сад, новы, хутчэй за ўсё, зробім яго філіялам. Гэта спросціць кіраванне, падбор і расстаноўку кадраў», — дадаў Юрый Прасмыцкі.

Між іншым, такая практыка ў абласных цэнтрах ужо існуе — у Гомелі некалькі гадоў дзейнічае аналагічны садок. Па такім жа прынцыпе гарадзенскія ўлады плануюць вырашыць праблему з недахопам месцаў у дзіцячых садках у мікрараёнах са шчыльнай забудовай. Галоўны плюс такіх рашэнняў — у магчымасці з цягам часу трансфармаваць пад іншыя патрэбы ўбудаванае памяшканне, напрыклад, для аказання бытавых паслуг ці пад краму, калі раён «састарыцца» і патрэбы ў дзіцячым садку тут ужо не будзе.

**Паводле БелТА.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 30 студзеня 2020 года.